

СУПРАЦЬ «ПЛЮШКІНЫХ» НЯМА ЗАКОНА? 7

ТАЯМНІЦЫ ШЛЮБУ АЛАІЗЫ ПАШКЕВІЧ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛЮТАГА 2021 г. АЎТОРАК № 29 (29398)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Увядзенне сямейнага капіталу дало вынік. Мы параўналі чатыры гады работы сямейнага капіталу з чатырма гадамі да таго, як мы прыйшлі да гэтага. Прырост шматдзетных сем'яў — на 40 %. Штогод нараджаецца 20 тысяч трэціх і наступных дзяцей, мы гэтую планку трымаем на працягу трох-чатырох гадоў. Думаю, нашы далейшыя крокі па ўдасканаленні і ўмацненні падтрымкі сем'яў дазволяць у тым ліку стабілізаваць сітуацыю па другіх дзецях. Другія дзеці — наш дэмаграфічны рэзерв, гэта нізкі старт, каб перайсці ў статус шматдзетнай сям'і».*

# Урок цяпла і дабрыні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маладая смаргонская сям'я Аляксандра і Анастасіі МАРКІНТОВІЧАЎ са сваім першынцам — аднагадовым сынам Цімафеем на прагулцы каля гарадскога Спаса-Праабражэнскага храма на беразе рачулкі Оксны.

## КОРАТКА

- **Найлепшыя прадпрымальніцкія ініцыятывы ў рэгіёнах атрымаюць падтрымку на суму да $25 тыс.**
- 14 лютага ў мінскім касцёле Узвышэння Святога Крыжа адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар беларускага мастака XIX стагоддзя Яна Дамеля.



- **Рыбалоўны фэст пройдзе 20 лютага ў Мінскім раёне.**
- Знішчэнне гнёздаў птушак у Беларусі забаронена з 16 лютага.
- **Авіякампанія «Расія» пачала палёты з Санкт-Пецярбурга ў Мінск.**
- Выручка рэзідэнтаў «Вялікага каменя» ў 2020 годзе вырасла ў 3,2 раза — да Br189 млн.


ISSN 1990 — 763X


Камунальныя стасункі

## ЧЫСТАЯ ВАДА, РАМОНТ ЖЫЛЛЯ, МЭТА-99



**Дзяржаўная праграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гады ўвайшла ў сілу ў Беларусі. На рэалізацыю яе мерапрыемстваў, што скіраваны на развіццё ЖКГ, сферы бытавога абслугоўвання, павышэнне даступнасці энерга- і газазабеспячэння ў населеных пунктах, запланавана 18 467,4 млн рублёў. Пра мэты і маркуемыя дасягненні чарговай пяцігодкі ўдасканалення камунальнай сферы расказаў начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ Андрэй РАМАШКА.**

Чакаецца, што задачы дзяржпраграмы будуць дасягацца за кошт павышэння эфектыўнасці і надзейнасці функцыянавання аб'ектаў ЖКГ з адначасовым зніжэннем затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП), а таксама прапанавання якасных бытавых паслуг і забеспячэння больш шырокага доступу грамадзян да энергетычных рэсурсаў.


СТАР. 7


Прыкметы часу

## МУКУ КУПЛЯЮЦЬ ЧАСЦЕЙ, ЧЫМ КАСМЕТЫКУ

### Пакупкі праз інтэрнэт падчас ізаляцыі і пасля

**Як вядома, Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) прагназуе, што COVID-19 не пакіне насельніцтва планеты на працягу яшчэ некаторага часу (магчыма, некалькіх гадоў). Укараненне новых лічбавых паслуг адбываецца сямімільнымі крокамі дзякуючы высокаму ўзроўню актыўнасці спажыўцоў «на канапе».**

У той жа час праблемы са здароўем і эканамічная нестабільнасць уносяць ашаламляльныя змены ў жыццё і паводзіны, якія будуць трансфармавацца яшчэ не раз, і залежаць ад задаволенасці новым вопытам, дэмаграфічных даных і інфраструктуры. Агульнае спажыванне скарачаецца, змесціва кошыка пакупак істотна змяняецца, зрэшты, як і спосаб атрымання пакупнікам інфармацыі. Кампаніям спатрэбіцца ўменне хутка пераасэнсоўваць сваё ўзаемадзеянне з кліентам, інакш не пазбегнуць структурных узрушэнняў у многіх сегментах...




СТАР. 9

З першых вуснаў

# «Трэба перабудоўвацца менавіта цяпер спакойна»

**Вынікі VI Усебеларускага сходу — несумненна, адна з самых папулярных тэм у нашым грамадстве. Асаблівая ўвага — маркуемай рэформе ў палітычнай сістэме, якой гэтым разам на форуме было аддадзена значнае месца, неабходнасць правядзення якой зафіксавана ў рэзалюцыі сходу. І ў гэтым важнае адрозненне сёлетняга сходу — нароўні з тым, як будзе развівацца краіна ў найбліжэйшыя пяць гадоў у сацыяльна-эканамічным плане, абмяркоўвалі і кірунак палітычны. За канстытуцыйную рэформу і ў сваім дакладзе, і ў заключным слове выказаўся і Прэзідэнт. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка абазначыў асноўныя прынцыпы, сваё бачанне грамадска-палітычных змен у краіне. Нагадаем значныя моманты з выступленняў беларускага лідара на гэты конт, бо гэтая тэма будзе адной з самых «гарачых» яшчэ не адзін тыдзень.**

## Пра эвалюцыю перамен

«Весь мы вызначылі гэты шлях. Намацалі яго зыходзячы з нашага вопыту, зыходзячы з нашага жыцця, ад зямлі мы яго намацалі і вызначылі, сёння прагаласавалі, прынялі. Вы ўпэўненыя, што заўтра не абрынецца на нас якая-небудзь чарговая пандэмія і нам не прыйдзецца карэкціраваць гэты курс? Я не ўпэўнены. Мы, вядома, будзем гэта рабіць, мы будзем імкнуцца, мы будзем ісці гэтым шляхам. Але ў жыцці могуць быць усялякія моманты, і да гэтага мы павінны быць з вамі гатовыя. Але нявызначанасці калясальныя. І сказаць, што мы, вось такія гераічныя, урачыстым маршам пройдзем і ўсё вырашым, нельга. І ў гэтыя няпэўныя хвіліны, хвіліны нявызначанасці нашай будучыні мы як ніколі павінны быць акуратныя, асцярожныя і адзіныя.

***Не час сёння ламаць і крышыць. Таму, ствараючы новую Канстытуцыю, мы будзем дзейнічаць вельмі акуратна і асцярожна».***

«Успомніце лозунг: «Перамены, перамены». Калі пытаеш: «Якія перамены?» — ніхто нічога не ведае. ***Перамены павінны быць. Гэта абсалютна правільна.*** І яны схапілі гэты лозунг, таму што ён заўсёды ляжа на сэрца і ў душу любога чалавека. Ніводны чалавек не хоча, каб гэта спынілася ўсё і закасцянела. Павінны быць перамены.

***Яшчэ раз паўтараю: нашы перамены — гэта не тое што не мяцеж, гэта нават не рэвалюцыя. Мы павінны рухацца эвалюцыйным шляхам. І мы гэта будзем рабіць.***

***І нам трэба будзе прапрацаваць і прыняць неабходныя навацыі ў заканадаўстве ў цэлым.*** Заканадаўства — гэта не толькі законы і Канстытуцыя, гэта і ўказы Прэзідэнта, і рашэнні ўрада, і гэтак далей».

***«Мы не пойдзем у 94-ы год, як нам прапануюць.*** Гэта, дарагія мае, гібель. І яны таксама не пойдуць да гэтага. Калі б яны ўзялі ўладу, ніякіх бы, як «лідар» нашай нацыі, якая сядзіць у Літве, кажа, новых выбараў не было б. Я гэта ведаю і ведаюць тыя, хто за гэтым працэсам назіраў. Там ужо стаяў мардач, якога ўзялі ў Гродне, нахабны, які б кіраваў краінай. А Святлана б смажыла катлеты, калі яна ўмее... Ніякіх бы выбараў новых не было, ясна, хто б кіраваў гэтым. Я ж вам казаў, я ў СІЗА пайшоў, каб паглядзець на іх. Абсалютна дэмакратычна прапанаваў: вы і я, няма прэзідэнтаў, няма нікога. Мы ўсе аднолькавыя. Яны казалі, што хацелі. Першы раз я іх перабіў, узяўшыся за галаву. На мяне Віктар Бабарыка глядзіць: а што такое? А Ціханоўскі аж гэты свой картуз прыўзняў. Я кажу: хлопцы, вы мяне прабачце, што я вас перабіваю. Яны са здзіўленнем глядзяць. Я, кажу, рады, што вы не прыйшлі да ўлады. І не таму, што вы б краіну перавярнулі. Вы б толькі паспрабавалі яе перавярнуць, а далей народ бы вас растаптаў.

Ён ніколі не прыме тую палітыку, якую яны прапануюць. А тую палітыку я ўжо перажыў. У часы ельцынскай Расіі, калі Гайдары і Чубайсы прапаноўвалі нам, і мы хутка ўсё прынялі ў Вярхоўным Савеце, пабеглі за Расіяй. Я, калі стаў Прэзідэнтам (многія гэта памятаюць), імгненна спыніў гэтую палітыку, адным махам перакрэсліўшы законы, якія мы следам за Расіяй прынялі. І пачалі выбудоўваць сваю сістэму ўлады. Правільна, няправільна, з памылкамі, без памылак, але мы яе пабудавалі. ***Няхай іншыя, як гэта гаворыцца ў народзе, зробяць лепш за нас. Яны прасунутыя, яны проста іншыя. Можа, ім і трэба іншае. Але класічныя рэчы — тое, без чаго не можа існаваць дзяржава — мы павінны ім перадаць».***

## Аб пераемнасці ўлады і статусе УНС

«Я разумею, што мы жывём у пераходны перыяд. ***Трэба зрабіць так, каб і новае пакаленне прыйшло да ўлады. Гэта непазбежна. І народ павінен вызначыцца, хто ад гэтага новага пакалення прыйдзе ва ўладу. Нам трэба сумленна, адкрыта, шчыра, не здаючы пазіцый правесці адкрытыя выбары, калі мы адпрацуем усе законы і Канстытуцыю».***

«Галоўная мая ўмова сыходу з улады — у краіне мір, парадак, ніякіх пратэсных дзеянняў, не пераварочваць краіну, выказваць у рамках закона меркаванне. Гэта галоўная ўмова.

Другая ўмова — калі складзецца так, што да ўлады прыйдуць не тыя і ў іх будуць іншыя погляды, другім пунктам мы запішам, што ні адзін волас з прыхільнікаў цяперашняга Прэзідэнта ўпасці не можа. Вось таму я прапанаваў Усебеларускі народны сход зрабіць канстытуцыйным органам, зрабіць яго з паўнамоцтвамі, што калі гэты грамадскі дагавор, які мы заключым, будзе парушаны, ўся ўлада будзе ва Усенароднага сходу. Нават без мяне. І Усенародны сход будзе абірацца яшчэ больш адказна людзьмі, будзе мець паўнамоцтвы. Ён павінен быць стабілізатарам на пераходны перыяд».

***«Я думаю, што Усенароднаму сходу трэба перадаць як паўнамоцтва галоўнае пытанне — вызначэнне стратэгіі развіцця нашага грамадства. І гэта будзе закон для ўсіх грамадзян краіны. І для кіраўніка дзяржавы, і для парламента, і для іншых. Якія? Суверэнітэт, незалежнасць нашай краіны. Абарона, бяздольнасць і іншае — падтрыманне на ўзроўні.*** Толькі галоўнае — без умяшання ў кіруючыя, выканаўчыя функцыі ў дзяржаве. Гэта будзе справа органаў улады і кіраўніка дзяржавы.

Нельга аслабляць кіраўніка дзяржавы. Гэта буду не я — гэта будзе іншы кіраўнік дзяржавы, але ён павінен быць кіраўніком дзяржавы! Ён павінен, як цяпер, адказваць за галоўныя напрамкі развіцця. ***Усенародны сход павінны быць стабілізатарам, парасонам усёй краіны на нейкі прамежак часу. Каб захаваць краіну».***

## Аб партыйным будаўніцтве

***«Трэба аддаць увагу пытанню партыйнага будаўніцтва. І калі мы ўбачым рэальныя партыі, тады мы будзем казаць, што трэба абіраць парламент па прапарцыянальным спісе, мясцовыя Саветы трэба абіраць па прапарцыянальным спісе.*** Цяпер народ наогул не ўяўляе, чым хтосьці там займаецца. Таму дае 3—6 працэнтаў партыям. Але партыі павінны быць. Так лягчэй будзе уладзе функцыянаваць. ***Але для гэтага трэба падрыхтаваць грамадства».***

«Гэта грамадства павінна быць сталым. Разумееце, партыі, вось мы зверху іх бачым — тры іх сапраўдных, якія адпавядаюць заканадаўству, ну хай пятнаццаць. Ад іх уніз прамой дарогай пойдуць іх ідэі, і мы такім чынам ідэйна можам падзяліць наша грамадства. Мы да гэтага гатовыя? Думаю, не. А ў гэты вострыперыяд, калі нас без партый падзялілі, гэта да чаго можа прывесці... ***Трэба ісці асцярожна, як па тонкім лёдзе, бо праваліся і не выкараскаемся. Вельмі акуратна гэта ўсё рабіць, і мы павінны народу гэта гарантаваць.*** І я ў тым ліку як кіраўнік дзяржавы.

***Сёння не час, яшчэ раз паўтараю, для сумніўных эксперыментаў. Гаворачы аб магчымых пераўтварэннях, мы павінны, безумоўна, зыходзіць з уласных нацыянальных інтарэсаў».***

## Аб нацыянальнай палітычнай традыцыі

«Намаганнямі продкаў, а таксама нашай з вамі працай за апошнюю чвэрць стагоддзя мы стварылі трывалыя тэхналагічныя вытворча-адукацыйныя і інтэлектуальныя асновы нашай дзяржавы. Гэта дазваляе нам глядзець у будучыню. Тым самым ***мы заклалі нацыянальную традыцыю шырокага абмеркавання эпахальных для краіны рашэнняў: Усебеларускі народны сход — рэферэндум — выбары.***

***Гісторыя пацвердзіла, што мы мелі рацыю, зрабіўшы стаўку на моцную ўладу ў 1996 годзе. Так, яшчэ раз паўтараю: трэба перабудоўвацца менавіта цяпер, спакойна. Але тады мы захавалі краіну, мы выратавалі адзінства, нас выратавала адзінства, дзяржаўная ўлада, парадак, моцная дзяржава, вертыкаль улады.*** Перад намі была бездань, у якую нас штурхалі. Памятаеце маю першую праграму — «Адвесці народ ад прорвы»? Усё, што я абяцаў, па вялікім рахунку, я выконваў. Так, былі недахопы па дробязях. Але мы не проста адвялі народ ад прорвы — мы ні адну дрэнь у нашу краіну не пусцілі. ***Мы будавалі чвэрць стагоддзя сваю краіну для нашых дзяцей».***

***«Найбліжэйшыя пяць гадоў — перыяд абнаўлення і ўдасканалення дасягнутага. Развіццё новых пунктаў росту ў эканоміцы і эфектыўных механізмаў ўключэння грамадства ў кіраванне краінай».***

Даслоўна

# ПРА ПЫТАННІ ІНТЭГРАЦЫІ І ЧАСОВЫЯ ЦЯЖКАСЦІ

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ даў вялікае інтэрв'ю расійскаму медыяхолдынгу РБК. Прыводзім некаторыя адказы кіраўніка галоўнага знешнепалітычнага ведамства краіны на найбольш значныя пытанні.**

Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства расказаў аб магчымым парадку дня планулмай у другой палове лютага сустрэчы прэзідэнтаў Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна.

«Сустрэча прапрацоўваецца, рыхтуюцца адпаведныя матэрыялы да гэтай сустрэчы і з аднаго, і з другога бакоў. І я думаю, што гэта таксама будзе вельмі важна з улікам таго, што ўжо і прэм'еры шмат разоў сустракаліся, і мы рушылі наперад у вырашэнні шэрага важных для абедзвюх краін пытанняў гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння. Таму сустрэча будзе», — сказаў міністр.


Фота БелТА.

Ён нагадаў, што нядаўна віцэ-прэм'ер Расіі Юрый Барысаў прыязджаў у Беларусь, і падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам былі дасягнуты шэраг важных дамоўленасцяў аб супрацоўніцтве ў сферы прамысловасці. «Таму дыялог па інтэграцыйнай праблематыцы не спыняўся. Бягучая руцінная работа праводзілася», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Адказваючы на пытанне, ці бачыць ён магчымасць развіцця адносін з Еўрасаюзам, Уладзімір Макей сказаў: «Я лічу, што гэта часовыя цяжкасці, нам трэба перажыць іх. Так, сёння Еўрапейскі саюз адназначна заклікае да санкцыйнага ціску на нашу краіну з падачы тых збеглых апанентаў улады, якія цяпер раз'язджаюць па еўрапейскіх гарадах і вёсках. Але, я думаю, рана ці позна прыйдзе ўсведамленне таго, што Беларусь мае важнае значэнне ў тым ліку для Еўрапейскага саюза. І захаванне дзяржаўнасці Беларусі, незалежнасці і яе суверэнітэту маюць важнае значэнне і для Еўропы».

Паводле слоў міністра, у яго працягваюцца кантакты з еўрапейскімі калегамі, хоць яны не моцна стараюцца гэта афішыраваць. «Мы праводзім тэлефонныя размовы. Вядома, шкада, што няма магчымасці сустрэцца асабіста ў вочным фармаце, але нават па тэлефоне яны прыслухоўваюцца да некаторых аргументаў, і я бачу, што рана ці позна гэтыя нашы афіцыйныя аргументы дойдуць да іх. І яны не будуць прыслухоўвацца толькі да апанентаў улады, якія заклікаюць толькі да санкцый, да перадачы ўлады і пры гэтым не прапануюць ніякага пазітыўнага парадку дня», — сказаў ён.

Па словах міністра, краіна гатовая працаваць з еўрапейцамі і абмяркоўваць любыя пытанні па знаходжанні шляхоў выхаду з гэтай сітуацыі. «Але гэта не азначае, што мы пагодзімся на тыя рэчы, якія яны прапануюць: трансфер улады, безумоўны сыход цяперашняга Прэзідэнта з пасады, змена ўлады праз рэвалюцыю, праз ціск вуліцы і гэтак далей», — рэзюмаваў Уладзімір Макей.

Ён таксама заявіў, што сапраўдная дэмакратыя павінна выспець унутры грамадства, а тыя, хто называе сябе дэмакратамі, паводзяць сябе абсалютна неадпаведна. Міністр адзначыў, што маюць месца адкрытыя пагрозы і запалохванні на адрас дзяржслужачых, ваеннаслужачых, супрацоўнікаў праваахоўных органаў, і яго сям'я сутыкнулася з гэтым.

«Я лічу, што гэтыя метады абсалютна несумяшчальныя з метадамі сапраўднай дэмакратыі. Я называю гэта фашысцкай дэмакратыяй. Я перакананы, што гэта так і ёсць. У прынцыпе, важна было б адмовіцца ад навешвання ярлыкоў, — заявіў Уладзімір Макей. — Усім — і ўладам, і «пратэстантам». Падумаць пра тое, што трэба ў дадзенай сітуацыі для беларускага народа. Але рабіць гэта не праз рэвалюцыю, не праз вуліцу, а ў рамках існуючага заканадаўства».




# «Прыемна, што медыцына будзе ўдасканальвацца»

Але для гэтага прыйдзецца шмат працаваць — тыя задачы, якія пастаўлены, трэба ажыццяўляць, перакананы **галоўны ўрач Шклоўскай цэнтральнай раённай бальніцы Сяргей НОВІКАЎ.** Ён працуе ў шклоўскай бальніцы 10 гадоў, з таго часу як прыйшоў сюды ўрачом-хірургам па размеркаванні пасля медуніверсітэта. У 2017-м быў прызначаны намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы, а праз два гады заняў пасаду галоўнага. Прызнаецца, што за гэты час Шклоў прыкметна папрыгажэў, стаў больш зручным для жыцця. З'явіліся сучасныя гандлёвыя цэнтры, лядовая арэна. Гэта ўсё на карысць гораду і яго жыхарам. На Усебеларускім народным сходзе пабываў упершыню і, прызнаецца, задаволены.


Фота БелТА.

— Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця, якую зацвердзілі, сур'ёзная, ёсць над чым папрацаваць. Было закранута асноўнае пытанне, якое мяне цікавіла, па медыцыне. Быццам бы агульнымі словамі, але зразумела, што прыйдзецца шмат працаваць — тыя задачы, якія пастаўлены, трэба ажыццяўляць. Прыемна, што будзе ўдасканальвацца медыцынская галіна, зарплаты будуць расці.

Яшчэ падчас работы дыялогавых пляцовак мы з калегамі выказваліся за ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя. Першапачатковая медыцынская дапамога аказваецца ў амбулаторыях, невялікіх цэнтральных раённых бальніцах, і хацелася б, каб пра іх не забываліся, забяспечвалі на належным узроўні, як і больш буйныя населеныя пункты. Зразумела, што высокатэхналагічная медыцынская дапамога павінна аказвацца на высокім узроўні, але на пярвічным звяне яна павінна быць якаснай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Прапрацоўваюцца магчымасці скарачэння рабочага дня на адну гадзіну для шматдзетных бацькоў

**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны, расказаў пра пастулаты сямейнай палітыкі на пяцігодку.** «Для таго каб сям'я была шчаслівая, дзяржава пры нараджэнні дзяцей гатовая аказаць падтрымку, бо матэрыяльны дабрабыт крыху пагаршаецца. Мы палічылі памер падтрымкі ад дзяржавы, якую атрымліваюць сем'і на працягу першага года жыцця дзіцяці, — за 2020 год гэта больш за 10 тысяч рублёў. Гэта і водпуск па цяжарнасці і родах, адзіная тэрміновая дапамога, дапамога па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў. Калі ў сям'і нарадзілася другое дзіця, памер дапамогі большы — сума раўняецца 14 тысячам рублёў», — паведаміў намеснік міністра.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сярод складнікаў шчаслівай сям'і — жыллё, таму, па словах Валерыя Кавалькова, прадугледжваюцца гарантыі па паляпшэнні жыллёвых умоў. Акцэнт зроблены у першую чаргу на шматдзетныя сем'і, але ёсць праграмы і для маладых сужэнцаў.

«Немагчыма быць шчаслівай сям'і, калі бацькі не могуць сумяшчаць сямейныя і працоўныя абавязкі. У гэты час мама, якая сыходзіць у водпуск па доглядзе за дзіцем, павінна мець магчымасць падтрымліваць сваю прафесійную кваліфікацыю, каб за тры гады не страціць прыцягальнасці для наймальніка. Таму жанчыны ў водпуску маюць права бясплатна павысіць кваліфікацыю ў службах занятасці ці прайсці перакваліфікацыю», — паведаміў прадстаўнік Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Па яго інфармацыі, для камфортнага сумяшчэння работы і догляду за дзіцем прадугледжваюцца гібкія формы занятасці, укараненне няпоўнай занятасці, дыстанцыйнай работы.

«Сёння бацькі, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, маюць права на скарочаны рабочы тыдзень, то-бок на адзін свабодны аплочваемы дзень. Але не заўсёды наймальнік можа дазволіць сабе адпусціць супрацоўніка на цэлы дзень. Таму адзін з кірункаў, які прапрацоўваецца, — скарачэнне рабочага дня на адну гадзіну», — расказаў Валерый Кавалькоў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Атмасфера народнага веча пакінула моцнае ўражанне»

— Я ўпершыню брала ўдзел ва Усебеларускім народным сходзе і, безмоўна, сама атмасфера народнага веча аказала на мяне моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. Я ганаруся тым, што ў нашай Беларусі настолькі моцная праграма далейшага развіцця, — заўважае ўдзельніца VI Усебеларускага народнага сходу — **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА.** — Вельмі натхніла выступленне Прэзідэнта. Звяртаючыся не толькі да дэлегатаў, але і да ўсяго народа, кіраўнік дзяржавы закрануў вельмі важную для нашай работы на месцах тэму — узмацненне ролі мясцовага кіравання і самакіравання. Справядліва, што цэнтры прыняцця рашэнняў павінны быць максімальна набліжаны да людзей. У сваю чаргу, наша задача — эфектыўная зваротная сувязь паміж уладай і насельніцтвам. Між тым, для мяне было вельмі цікава азнаёміцца з перспектыўнымі планамі сацыяльнай падтрымкі. Важна, што праграмы, накіраваныя на дапамогу шматдзетным бацькам, будуць пашыраны, што сацыяльная сфера злучана з развіццём эканомікі. Такія падыходы сведчаць пра правільны курс, які падтрымаў народ.


Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

У сваім звароце на народным вечы Прэзідэнт звярнуў увагу таксама на ўмацаванне дэмаграфічнай бяспекі, развіццё медыцыны, яе даступнасць і мабільнасць, падтрымку сямейных каштоўнасцяў. Лічу, што асаблівай увагі таксама заслугоўваюць комплексны падыход праграмы «Моцны рэгіён», задачы якога былі агучаны на Усебеларускім народным сходзе.

Заслуханыя выступленні натхнілі і далі і мне новы імпульс у рабоце. Так, нам ёсць над чым працаваць у сферы інфармацыйнага поля — наладжваць адносіны з людзьмі, якія актыўна карыстаюцца сацсеткамі, расказваць аб сваёй рабоце, матываваць грамадзян уключацца ў сумесную дзейнасць. Мы плануем актывізаваць работу з сельскай працоўнай моладдзю, развіваць і далей маладзёжны рух. Лічым вельмі важным больш цеснае ўзаемадзеянне прадпрыемстваў Гомельскага раёна з навучальнымі ўстановамі. Гэта паўплывае на далейшае замацаванне выпускнікоў у глыбінцы, імкненне атрымаць спецыяльнасць, каб працаўладкавацца ў сваіх родных мясцінах. Важныя таксама падтрымка і развіццё прыватных ініцыятыў, каб прадпрымальнікі былі зацікаўлены адкрываць у сельскай мясцовасці новыя прадпрыемствы і павышаць працоўную занятасць.

Сёння на тэрыторыі Гомельскага раёна актыўна развіваецца інфраструктура, будуецца жыллё, арганізуецца вольны час. Лічу, што жыхары сельсаветаў павінны больш актыўна дапамагаць мясцовай уладзе рабіць жыццё на вёсцы яшчэ камфортнейшым, берагчы і добраўпарадкоўваць родныя населеныя пункты.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «Кранулі словы пра моладзь і дзяцей»

— Мне выпаў гонар быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. За гэты час адчула асаблівую атмасферу адзінства народа. Гэта былі насычаныя і яскравыя два дні. Наогул светлых, пазітыўных уражанняў, станоўчых эмоцый вельмі шмат, — адзначыла **Ірына ЕЛЕНСКАЯ, старшыня Віцебскага абласнога савета грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя».** — Вельмі кранальнае было выступленне кіраўніка дзяржавы. Гонар перанапаўняе сэрца за нашага Прэзідэнта, які ў самых цяжкіх сітуацыях паказвае цвёрдасць характару і моц духу, абараняючы нашу Айчыну, будучы беззапаветна адданым ёй.



На сходзе былі вельмі жывыя зносіны, мы абмеркавалі шырокае кола пытанняў, якія хвалююць наша грамадства і, канешне, моладзь! Добра, што пачулі пра дзяржаўную маладзёжную палітыку. Кіраўнік краіны патрабаваў узмацніць работу сістэмы адукацыі з маладым пакаленнем.

Наша задача як дэлегатаў, якія займаюцца выхаваннем, дапамагчы дзецям і падлеткам раскрыць свой талент, стаць сапраўднымі патрыётамі, для якіх вельмі важна, каб у краіне былі мір, паразуменне і павага паміж людзьмі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Органы дзяржаўнага кіравання павінны больш эфектыўна працаваць з моладдзю

**У гэтым упэўнены Генадзь ІВАНЧЫН, начальнік упраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Брэсцкага гарвыканкама.** Размаўляючы з карэспандэнтам «Звязды», ён адзначыў, што ў дакладзе Прэзідэнта на Усебеларускім народным сходзе робіцца акцэнт на выхаванне ў маладога пакалення пачуцця самастойнасці.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Выхаванне самастойнасці, умення выходзіць са складаных сітуацый, вырашаць праблемы — гэта залог жыццёвага поспеху маладога чалавека. Тут кіраўнік краіны, безумоўна, выказаў вельмі разумную думку — мы павінны іх да гэтага рыхтаваць, да самастойнасці і адказнасці. Прагучаў вельмі цікавы і правільны тэзіс, што мы павінны ісці да моладзі, расказваць ёй пра тое, што адбываецца ў сацыяльна-эканамічным жыцці, якія ёсць праблемы і дасягненні», — заявіў Генадзь Іванчын.

Паводле яго слоў, органы дзяржаўнага кіравання павінны працаваць больш эфектыўна ў гэтым кірунку, рыхтуючы моладзь да рэальнага жыцця. Генадзь Іванчын сцвярджае, што маладым людзям неабходна бачыць: так, ёсць праблемы, але і ёсць дасягненні, дзяржава прыкладвае каласальныя намаганні, каб жыццё ў краіне было лепшым.

«Гэтыя ідэі кіраўніка краіны, безумоўна, павінны быць галоўнымі пры правядзенні маладзёжнай палітыкі ў рэспубліцы. Калі казаць пра горад Брэст, мы стараемся, каб такія прынцыпы вызначалі нашу работу з моладдзю горада. Работа з моладдзю — гэта сучаснасць і будучыня», — упэўнены прадстаўнік гарвыканкама.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Далучайся!

# СУСТРАКАЕМ ТЫДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

**Мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага, пройдуць у Нацыянальнай акадэміі навук.**

У 2021 годзе, вызначаным у нашай краіне як Год народнага адзінства, асаблівае значэнне набывае навукова-практычнае забеспячэнне пасляховага функцыянавання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, у якіх павінна выкарыстоўвацца дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі. База для гэтага створана ў акадэмічным Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа (цяпер — адзін з філіялаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), паколькі менавіта гэтая ўстанова забяспечвае каардынацыю і правядзенне сістэмных даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства. Інстытутам мовазнаўства запланавана правядзенне шэрагу мерапрыемстваў у рамках святкавання Міжнароднага дня роднай мовы.

Так, **15 лютага** у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі прайшоў круглы стол «Акадэмік Яўхім Карскі — заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф».

**16 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбудзецца прэзентацыя кнігі «Шкляр Г. З. Выбраныя працы. Моўная спадчына» і круглы стол «Беларуская мова ў кітабах». Кітабы ствараліся з XVI ст. татарамі, што пасяліліся ў Вялікім Княстве Літоўскім. Кітабы — шматмоўныя рукапісы, у якіх дамінуе тагачасная беларуская народна-дыялектная мова, пры гэтым напісаны яны арабскім пісьмом.

**17 лютага** ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа ў рамках мерапрыемстваў Школы юнага лінгвіста адбудзецца сустрэча з навучэнцамі, настаўнікамі і дырэктарам мінскай гімназіі № 25. У праграме — знаёмства з работай айчынных вучоных-мовазнаўцаў, навукова-практычны семінар на тэму «Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій пры вывучэнні беларускай мовы», гульня-віктарына па фразеалогіі і безэквівалентнай лексіцы.

**18 лютага** ў рамках мерапрыемстваў Школы юнага лінгвіста будзе праведзены трэці Адкрыты конкурс расказчыкаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак».

У БНТУ запланавана сустрэча з беларускімі і замежнымі студэнтамі на тэмы «Па старонках беларускай кнігі» і «Беларуская мова — дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь».

Таксама ў гэты дзень адбудзецца прэзентацыя электроннага перавыдання класічнай працы Івана Насовіча «Словарь белорусского наречия» — галоўнай крыніцы слоўнікаў беларускай мовы канца XIX — першай паловы XX стагоддзяў. Адрасавана яно мовазнаўцам, гісторыкам, этнографам, фалькларыстам і ўсім, каго цікавіць беларускае слова.

**19 лютага** ў 13.00 адбудзецца Рэспубліканская дыктоўка па беларускай мове. Узяць удзел у ёй можна непасрэдна ў памяшканні Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі (вул. Сурганава, д. 15) або ў фармаце анлайн. Для ўдзелу неабходна будзе прайсці рэгістрацыю (запоўніць Google-форму). А ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа адбудзецца прэзентацыя дакументальнага фільма «Гаворкі Беларусі» аб дыялектных групах гаворак беларускай мовы і іх адметных асаблівасцях.

**22 лютага** ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа будзе праведзены круглы стол на тэму «Стварэнне беларускамоўнай заканадаўчай базы як фактар гарманічнага развіцця грамадства». Удзел у пасяджэнні возьмуць супрацоўнікі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, члены Экспертнага савета па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову, члены Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры НАН Беларусі, спецыялісты Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа і выкладчыкі ВНУ.

**Міжнародны дзень роднай мовы — штогадовае свята, заснаванае ў 1999 годзе рашэннем Генеральнай сесіі ЮНЕСКА. Яго галоўная мэта — захаванне моўнай і культурнай разнастайнасці ў свеце, падтрымка нацыянальных моў і культур, а таксама забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

## Тэмпературныя «арэлі» па максімуме

### Калі ўдзень па поўдні краіны слабы плюс, уначы месцамі амаль да мінус 30

**Палова лютага ўжо ззаду, ды і сонца з кожным днём свеціць усё ярчэй. Толькі нам ад гэтага цяплей не становіцца. На працягу гэтага рабочага тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны ў асноўным будзе вызначаць воблацсь павышанага атмасфернага ціску, таму істотных ападкаў у асноўным не чакаецца. Толькі ў сераду і чацвер у паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх раёнах пад уплывам атмасферных франтоў пройдзе кароткачасовы снег. Захаваецца марознае надвор'е, хоць у разрэзе краіны тэмпературны фон будзе дастаткова кантрасны. Па паўднёвым захадзе краіны маразы будуць менш моцныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду ў паўночна-заходніх і паўночна-ўсходніх раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 10 градусаў да 17 марозу, па паўднёвым захадзе краіны — мінус 7—9 градусаў. Удзень на ўсёй тэрыторыі 3—10 градусаў ніжэй за нуль, па паўднёвым захадзе — ад мінус 2 градусаў да плюс 1 цяпла.

У чацвер і пятніцу нас зноў чакаюць амаль арктычныя маразы. У чацвер будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы месцамі па паўднёвым захадзе Беларусі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 16—23 марозу, месцамі — да 25 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах 10—15 градусаў са знакам мінус. Удзень у асноўным будзе 7—14 градусаў ніжэй за нуль, па паўднёвым захадзе — мінус 4—6 градусаў.

Уначы ў пятніцу неба будзе практычна чыстае, а таму маразы стануць найбольш трaскучыя. Чакаецца пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 20—26 марозу, месцамі — да мінус 28 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — мінус 16—19 градусаў. Удзень моцнае і яркае сонца злёгку прыгрэе — будзе «ўсяго» 7—14 градусаў ніжэй за нуль. А па паўднёвым захадзе краіны будзе і зусім цёпла — ад мінус 3 градусаў да 6 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Зрабі лунку — дапамажы рыбе

**У сувязі з умовамі надвор'я ў зімовы перыяд, якія склаліся, у мэтах недапушчэння масавага замору рыбы на водных аб'ектах краіны, выкліканага зніжэннем утрымання растворанага ў вадзе кіслароду, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя звяртаецца да ўсіх неабыякавых да прыроды грамадзян, рыбаловаў-аматараў і грамадскіх прыродаахоўных арганізацый з просьбай аказаць дапамогу ў свідраванні лунак на вадаёмах, што замерзлі.**

Каб не замерзла вада ў лунцы, неабходна вертыкальна ўставіць у яе пук чароту або саломы.

Такія мерапрыемствы будуць садзейнічаць насычэнню вады кіслародам і, адпаведна, дазволяць захаваць рыбныя рэсурсы.

Таксама міністэрства просіць грамадзян паведамляць пра выпадкі масавага падыходу рыбы да лункі на водных аб'ектах у абласныя камітэты, раённыя і гарадскія інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Падрабязнасці

# У СНЕГАВОЙ ПАСТЦЫ

**Цыклон «Фолкер», які пракаціўся праз нашу краіну ў канцы мінулага тыдня, моцна ўскладніў жыццё на Гомельшчыне і Магілёўшчыне завірухамі і снегападамі. Паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, месцамі таўшчыня снегавога покрыва перавышае нават 50 сантыметраў. І праз гэта істотна ўскладнілася сітуацыя на дарогах. На дапамогу прыходзілі ратавальнікі...**





Толькі за 13 лютага супрацоўнікі МНС дапамаглі вызваліць са снежнага палону 254 аўтамабілі. Амаль палова з іх прыйшлася на Магілёўшчыну, прыкладна чвэрць — на Мінщчыну. А раніцай у суботу паступіла паведамленне аб заторы на аўтадарозе «Мінск — Мікашэвічы» каля вёскі Радкава Салігорскага раёна. У снезе захрас аўтобус, які ехаў з Салігорска ў Мінск. Ён вёз 40 чалавек — 27 дзяцей і 13 дарослых. Пацярпелых, на шчасце, не было. Яшчэ адзін аўтобус не змог выехаць з намеці паблізу вёскі Скалодзін Мазырскага раёна. Буксіравалі ратавальнікі і грузавікі, і машыны хуткай дапамогі...

Некалькі выездаў былі звязаны з тым, што людзі трапілі ў снегавую пастку, знаходзячыся ў сябе дома. Намець была такая, што немагчыма было адчыніць уваходныя дзверы. Два такія выпадкі «разблакіроўкі» адзінокіх пенсіянераў мелі месца ў Рагачове.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Італіі прыступіў да работы новы ўрад



Савет міністраў Італіі на чале з былым старшынёй ЕЦБ Марыё Драгі правёў сваё першае пасяджанне, паведаміла італьянскае тэлебачанне. Раней прэм'ер і ўсе 23 яго міністры прынеслі прысягу ў прысутнасці прэзідэнта краіны Серджа Матарэлы ў Квірынальскім палацы. Драгі сфармаваў урад, каб пакласці канец палітычнаму крызісу: ранейшы Савет міністраў на чале з Джузэпэ Контэ страціў стабільную падтрымку большасці ў парламенце. У выніку Матарэла вырашыў, што з улікам пандэміі каранавіруса праводзіць датэрміновыя выбары было б неразумна. Замест гэтага ён даручыў Драгі сфармаваць «непалітычны» ўрад для працягу барацьбы супраць пандэміі і выкліканых ёю эканамічных праблем.

## У Японіі на фоне пандэміі з'явіцца пасада міністра па адзіноце



Ва ўрадзе Японіі з'явіцца міністр, які будзе адказваць за праблемы адзінокіх жыхароў краіны, паведаміла газета «Нікэй сімбун». Пасаду будзе сумяшчаць міністр па рэгіянальным развіцці Тэцусі Сакамота, паведаміў прэм'ер Ёсіхідэ Суга. Таксама чыноўнік курыруе пытанне барацьбы са зніжэннем нараджальнасці. Ён падкрэсліў, што рашэнне было прынята на фоне праблем, якія ўзніклі з-за пандэміі каранавіруснай інфекцыі, і, як вынік, абвастрэння сацыяльных складанасцяў. Урад Японіі мае намер дапамагчы адзінокім жыхарам вырашаць іх праблемы, асабліва пры надзвычайных сітуацыях, калі ізаляцыя абмяжоўвае кантакты людзей, што прыводзіць да страты ўстойлівых сацыяльных сувязяў.

## Археолагі знайшлі ў Егіпце найстаражытнейшы бровар



Амерыканскія і егіпецкія археолагі выявілі, як мяркуецца, найстаражытнейшы ў свеце бровар, паведаміла Associated Press. Яго знайшлі падчас раскопак на тэрыторыі Абідаса — старажытнага горада Егіпта, а цяпер археалагічнай зоны. Гэтае месца знаходзіцца ў пустыні на захад ад Ніла, за 450 кіламетраў на поўдзень ад Каіра. Як паведаміў кіраўнік Вышэйшага савета па справах старажытнасцяў Мустафа Вазіры, бровар, верагодна, адносіцца да часоў фараона Нармера — заснавальніка першай дынастыі Ранняга царства (3150 — 2613 г. да н.э.). Адзначаецца, што брытанскія археолагі яшчэ ў 1900-х гадах заяўлялі пра існаванне піваварні, але тады не змаглі адшукаць яе.

# Памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў ушанавалі ўчора ў Мінску на востраве Мужнасці і Смутку

«Вайна ў Афганістане, праз якую прайшло каля 30 тысяч беларусаў, стала асаблівай старонкай нашай гісторыі. І трагічнай, і гераічнай, дзе кожны радок прасякнуты пачуццём глыбокай павагі да кожнага савецкага салдата, які прайшоў тымі пыльнымі ваеннымі дарогамі, — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Наступствы таго, што адбылося ў Афганістане, свет адчувае да гэтага часу і спрабуе з гэтым змагацца. Гэта міжнародны тэрарызм, наркатрафік, грамадзянскія міжусобіцы, жорсткае процiборства сусветных дзяржаў. Усе гэтыя панцццi актуальныя і сёння, але менавіта тады людзі пачалі сур'ёзна гэтаму супрацьстаяць. Беларускія воіны-афганцы ўклалі ў гэта свае сілы. Яны з гонарам выканалі свой салдацкі абавязак, стаўшы сапраўдным прыкладам служэння Радзіме».

На мітынгу ў памяць аб загінулых воінах-інтэрнацыяналістах усклалі вянкі і кветкі ад міністэрстваў і ведамстваў, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый і ветэранаў да помніка «Сынам Айчыны, якія загінулі за яе межамі».



Фота БелТА

Мой сучаснік

# ЁН ТАК ЛЮБІЦЬ СЛУХАЦЬ ЦІШЫНЮ

## На Бялыніччыне, што ў Магілёўскай вобласці, Аляксандр ЮШКЕВІЧ — чалавек і вядомы, і пазнавальны

**На яго жыццё, асабліва ў маладыя гады, прыпала вельмі шмат выпрабаванняў. Некаторыя з іх маглі б аказацца не па сіле нават загартаванаму даросламу чалавеку. А ён, юнак, з гонарам, нібы праз агонь, ваду і медныя трубы, прайшоў праз іх, захаваўшы пры гэтым уласныя годнасць, дабрыню, чалавечнасць і міласэрнасць.**



Учора ў Беларусі адзначалі Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Зварот да ветэранаў афганскай вайны накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

«15 лютага для вас — воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія прайшлі праз горан афганскай вайны, — гэта дзень памяці, мужнасці і непарушнага баявога братэрства», — гаворыцца ў звароце. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь славіць жывых герояў і памятае пайменна ўсіх сваіх сыноў, якія не вярнуліся з той вайны, шануе іх памяць і смуткуе разам з роднымі і блізкімі. «Вы з гонарам выканалі свой салдацкі абавязак, як нашы бацькі і дзяды — героі Вялікай Айчыннай вайны. Сёння вы самі — ветэраны, надзейная апора дзяржавы і прыклад для моладзі ў служэнні Радзіме. Ваша цвёрдая патрыятычная пазіцыя дапамагае захаваць мір і стабільнасць у краіне, цану якім вы ведаеце, як ніхто іншы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Не зламіўся пад цяжарам усіх нягод, выстаяў і ў такіх страшных выпадках, калі даводзілася трымацца з самых апошніх фізічных і маральных сіл, выжываючы праз пакуту. Калі смерць хадзіла побач. Калі лёгка можна было ўпасці ў адчай ці баязлівасць. Калі сваю нерашучасць можна было б лёгка апраўдаць сітуацыяй, што на той момант склалася: маўляў, не было ніводнай магчымасці паступіць інакш. Так рабілі і робяць многія, хвалюючыся за сваё здароўе, калоцячыся за жыццё, усімі даступнымі сродкамі дабіваючыся прыхільнасці і любові начальства. Абы толькім самім было добра ды жылося шчасліва.

Але ёсць і такія людзі, як Аляксандр Юшкевіч. Людзі-арыенціры. Людзі-прыклады.

Ён рана, у няпоўныя дзесяць, страціў бацьку. Хочаш не хочаш, а давялося вельмі хутка стаць не па гадах дарослым, галоўнай адзнакай чаго з'яўляецца выключна высокая асабістая адказнасць за свае словы, учынкі, паводзіны. І Аляксандр Піліпавіч гэтую адказнасць, як свой духоўны крыж, з годнасцю нясе праз усё жыццё, праз усе выпрабаванні — ці то радасцю, ці то бядой. І ніколечкі не шкадуе, што выбраў такі шлях, што выпала яму такая доля.

У школьныя гады ён вызначыўся і са сваёй будучай прафесіяй. Хоць быў гараджанінам, марыў працаваць на зямлі. Як, бадай, і ўсе юнакі, ён вельмі любіў тэхніку і ўсё тое, што было з ёй так ці інакш звязана.

Але надышоў для бялыніцкага юнака час ісці ў армію. На той момант нават і слова такога — «адкасіць» — не існавала. А на хлопцаў, якія па нейкіх прычынах не адслужылі ў арміі, і дзяўчаты асабліва не заглядаліся — бо які з такога атрымаецца гаспадар сям'і, калі ён не прайшоў армейскую школу жыцця?

У сваe васямнаццаць гадоў Саша Юшкевіч адправіўся служыць у Савецкую Армію з радасцю і гонарам, з вялікай ахвотай.

Пасля «вучэбкі» ў Фергане, у якой юнаку давялося пераадолець сябе і загартаваць характар, ён трапіў служыць у 350-ы полк 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі, якой камандаваў легендарны генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза (1988) Павел Грачоў. Дывізія ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістане дыслацыравалася ў Кабуле. Так для юнака з Бялыніч пачаліся 22 месяцы самай сапраўднай вайны.

Аўтар гэтых радкоў з добры дзясятак разоў падступаўся да Аляксандра Піліпавіча, каб расказаў хоць бы некалькі эпізодаў са сваёй вайны. Безвынікова. Пра баявых таварышаў гаварыў многа, у дэталях расказваў пра сваю родную роту. А пра сябе — так, спехам, як бы між іншым.

Даведаўся, што баявая рота, у складзе якой праходзіў тэрміновую службу Аляксандр Юшкевіч (толькі ўявіце сабе!), за 22 месяцы ўдзельнічала ў больш чым паўсотні значных баявых аперацый. У адной з іх, ці не самай жорсткай, загінуў кожны трэці: з 60 байцоў і камандзіраў сумна вядомым «грузам-200» вярнулася да бацькоў, жонак і дзяцей, вярнулася ў родную зямлю 20 чалавек.

— Спачатку нават не верылася, — прыгадвае той жудасны момант Аляксандр Піліпавіч, — што яны — забітыя, што іх ужо няма! Што ўжо ніколі з імі не пагавару. Яшчэ ўчора з некаторымі пра нешта марылі. Уяўлялі сабе, як праз год вернемся дамоў, чым займемся на «грамадзянцы»... А зараз... Ляжаць хлопцы... Маладыя, можа, яшчэ і не пацалаваныя дзяўчатамі. Звыкнуцца са смерцю немагчыма!

Часта ўспамінаю і, здаецца, бачу, як жывых, сваіх баявых сяброў — Ігара Шашкіна, Віктара Дымава, Ігара Бондарава...

У гарах Афганістана смерць хадзіла і за ім, Аляксандрам Юшкевічам.

У снежні 1987 года ўзвод, у якім ён служыў намеснікам камандзіра, трапіў у акружэнне душманаў. Падчас прарыву Аляксандр прыкрываў адыход сваіх байцоў. Быў цяжка паранены. Каля трох месяцаў лячыўся ў шпіталі. Пасля выздараўлення камандаванне



вырашыла перавесці адважнага дэсантніка для далейшага праходжання тэрміновай службы ў вайсковую часць, што дыслацыравалася ў горадзе Тула. Мусіць, хацела зрабіць для салдата палёгку. Але Аляксандр Юшкевіч катэгарычна не пагадзіўся з такім рашэннем і дабіўся-такі таго, каб яму дазволілі працягнуць службу тут, у Афганістане.

— Гэта быў мой свядомы выбар, — растлумачыў Аляксандр Піліпавіч. — Той, хто прайшоў баявымі дарогамі гарачы Афган, ніколі не будзе хавацца за чужыя плечы.

А ў гэты час у далёкіх ад Афганістана Бялынічах вельмі непакоілася за сына маці. Каб не загінуў! Каб не параніла! Каб у палон не трапіў! Колькі бяссонных начэй праплакала Лідзія Андрэеўна! Гэта вядома толькі адной ёй.

Аднойчы ў гутарцы сённяшняя староста вёскі Пільшычы Ганна Бучманава, якая якраз у той час працавала паштальёнам у Бялынічах, згадала, як моцна перажывала за Сашу яго маці.

— Калі, перабіраючы пісьмы, — расказвала Ганна Піліпаўна, — знаходзіла ліст ад Сашы, адразу ж несла яго Лідзіі Андрэеўне. На аўтавакзал, дзе тая працавала дыспетчарам, альбо дамоў. Ведала, як яна чакае ад яго вестачку. І тую радасць яе мне цяжка, немагчыма перадаць нейкімі словамі.

У снежні 1989 года дэсантнік Аляксандр Юшкевіч вярнуўся дадому. Але мірнае жыццё давалася ўчарашняму воіну-інтэрнацыяналісту не так ужо і лёгка. Прыстасавацца, а тым больш знайсці сябе ў ім, як, дарэчы, і многім учарашнім воінам-«афганцам», яму таксама было досыць складана. Яшчэ не адзін год здані недалёкага мінулага чорнымі хмарамі выбухаў, пякучым сонцам вярталіся да яго па начах, у сне: і крычаў, і плакаў, і халодным потам абліваўся.

Даволі складаным аказаўся і выбар мірнага занятку. Паступіў вучыцца на факультэт фізічнага выхавання МДУ імя А. Куляшова. Але хутка зразумеў, што гэта зусім не яго справа. І тут паспрыяў выпадак: сябры падказалі, што ў Бялыніцкім РАУС ёсць вакантныя пасады. Так на самым пачатку лістапада 1990 года Аляксандр Юшкевіч апрануў міліцэйскую форму і заняў пасаду памочніка аператыўнага дзяжурнага АДС райаддзела міліцыі, потым прадоўжыў службу міліцыянерам аддзялення патрульна-паставой службы. У 1992 годзе вярнуўся ў аператыўную дзяжурную часць РАУС, дзе і праслужыў на пасадах памочніка аператыўнага, старшага аператыўнага дзяжурнага да выхаду на заслужаны адпачынак.

Калегі распавядаюць, што лейтэнант міліцыі Аляксандр Юшкевіч, праслужыўшы ў РАУС дваццаць шэсць гадоў, увесь гэты час свае службовыя абавязкі выконваў узорна, адказна і прафесійна. Да чаго прывык яшчэ з ранняга дзяцінства і да гэтага прывучыў сваіх сына з дачкой.

Раман працуе намеснікам кіраўніка калектыву магазіна ў Бялынічах. Вольга зараз вучыцца на другім курсе Мінскага юрыдычнага каледжа. Пайшла, можна сказаць, па бацькавых слядах.

— Мне дужа пашанцавала з жонкай, — прызнаецца Аляксандр Піліпавіч. — Наталля Анатолеўна, якая працуе бухгалтарам дапаможнай школы-інтэрната для дзяцей-сірот, у свой час вельмі дапамагла мне ўтрымацца на маіх пасляафганскіх жыццёвых хвалях і віражах. Хутка будзе трыццаць гадоў, як жывём разам: рука ў руку, душа ў душу.

Што ж да дзяцей, то выхоўваем іх на сваіх прыкладах. Чытаць ім мараль, расказваць, як правільна сябе трэба паводзіць у той ці іншай сітуацыі, лічу дарэмным заняткам. У дзяцей ёсць бацька, маці. На іх глядзіце, на іх жыццёвых сітуацыях вучыцеся. А галоўны пасыл, ён жа ад веку людскога вядомы ўсім: ты павінен так адносіцца да людзей, як хацеў бы, каб яны так ставіліся да цябе!

Аляксандр Піліпавіч актыўна ўдзельнічаў і ўдзельнічае ў грамадскім жыцці раёна. Ён узначальвае савет пярвічнай арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, з'яўляецца намеснікам старшыні райарганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», клапоціцца пра папаўненне экспанатамі музея гісторыі РАУС, выбіраўся дэпутатам райсавета дэпутатаў некалькіх скліканняў, у тым ліку і бягучага, дваццаць восьмага.

— Па меры сіл і магчымасцяў заўсёды стараюся дапамагчы чалавеку, — кажа Аляксандр Юшкевіч. — Я добра ведаю, што такое ўзаемавыручка, узаемадапамога, плячо чалавека, якое было падстаўлена табе ў цяжкі момант. Аказваць людзям дапамогу, быць патрэбным ім і запатрабаваным імі — гэта ўсё роўна як донарства: здаўшы кроў дзясятак разоў, ты проста ўжо мусіш яе здаваць, бо гэтага патрабуе твой арганізм.

Аляксандр Юшкевіч быў у шэрагах дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу.

— Мне, — тлумачыў ён перад ад'ездам на важны форум, — вельмі хацелася б, каб былі прынятыя такія рашэнні, якія потым мы, усім грамадствам, супольна, нягледзячы на пэўныя палітычныя разыходжанні ў сваіх поглядах, з вялікім энтузіязмам будзем рэалізоўваць, ажыццяўляючы прынятыя планы і заданні.

Аб тым, што жыццёвы шлях майго сучасніка, бялынічаніна Аляксандра Юшкевіча быў нялёгкі і няпросты, дзе знайшлося месца подзвігам, мужнасці, адвазе, вытрымцы, узорнай працы, сведчаць яго дзяржаўныя ўзнагароды: ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За бездакорную службу» III ступені, іншыя шматлікія ўзнагароды Афганістана, СССР, Рэспублікі Беларусь.

**Міхась КАРПЕЧАНКА.**

**Фота аўтара і з хатняга архіва Аляксандра ЮШКЕВІЧА.**

## Извещение о проведении 25 марта 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «весовая проходная» общей площадью 62,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21229 (составные части и принадлежности: одноэтажное панельное здание весовой проходной с технологической асфальтобетонной площадкой а, пешеходной дорожкой а1); «административно-производственный корпус» общей площадью 346,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21228 (составные части и принадлежности: одноэтажное бетонное здание административно-производственного корпуса с двумя пристройками Б1/к, В1/к); «здание мехмастерских» общей площадью 347,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21226 (составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание мехмастерских с пристройкой Б1/к); «бытовой корпус» общей площадью 187,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21227 (одноэтажное кирпичное здание бытового корпуса); «туалет кирпичный» общей площадью 4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21225 (одноэтажное здание кирпичного туалета); «водопроводная сеть» с инв. № в ЕГРНИ 601/С-21231 (составные части и принадлежности: водопроводная сеть В, артезианская скважина В1, водопровод В2); «электросеть» с инв. № 601/С-21234 (составные части и принадлежности: электросеть, состоящая из девяти участков сети 1.1, 1.2, 1.3, 1.4, 1.5, 1.6, 1.7, 1.8, 1.9, комплектной трансформаторной подстанции 1.10 с опорой линии электропередач 1.10.1); «трансформатор силовой», инв. №706-1 |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,1412 га, кадастровый номер – 623200000028000002 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Логойский р-н, район г. п. Плещеницы |
| Начальная цена – 44 850,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 4 400,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 25 марта 2021 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 17.02.2021 по 23.03.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:

(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

## Извещение о проведении 1 марта 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)* |
|---|
| «Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырьё для производства нефтяных вязких дорожных битумов» в количестве 1 100 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилищах, расположенных по следующим адресам: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. Волкова, 43; Минская область, Минский район, г. Заславль, ул. Заводская 17/3; Минская область, Слуцкий район, Козловичский с/с, д. Великая Слива, АБЗ-2 |
| Начальная цена: 81 840,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 8 100,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется самостоятельно произвести выемку содержимого битумохранилищ (продаваемого имущества). Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 1 марта 2021 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 16.02.2021 по 25.02.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:

(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

## ООО «Фрондера»

### извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт» в форме открытого аукциона

| № Лота | Наименование предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | капитальное строение с инв. № 400/С-81420 (гараж), 372 кв. м | 135 360,00 | 13 536,00 | 6 768,00 |
| 2 | капитальное строение с инв. № 400/С-81415 (склад), 122 кв. м | 44 448,00 | 4 444,80 | 2 222,40 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся вторые повторные торги. Цена на предмет торгов снижена на 20 %.
Публикации о прошлых аукционах ранее размещались в газете «Звязда» № 148 (29262) от 01.08.2020, № 217 (29331) от 06.11.2020.
Лоты 1, 2 расположены на земельном участке с кадастровым номером 440100000002007546, расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Дубко, 11, площадь 0,4735 га с целевым назначением – для закрепления участка базы. Участок предоставлен на праве постоянного пользования

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения открытого аукциона | **26 февраля 2021 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1121 |
| **Начало приема заявлений в 10:00 16.02.2021. Окончание приема заявлений в 18.00 25.02.2021.** | |
| Условия для участия в торгах | 1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** код банка ALFABY2X УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт», назначенных на __.__.2021, по Лоту №__. Срок внесения задатка: – с 16.02.2021 в 10:00 по 25.02.2021 в 16.00.<br>2. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/info.<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. Контактное лицо для подачи заявлений +375293082897, Анаида.<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (5 % от конечной цены предмета торгов) и затрат по размещению публикации в газете на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 3 (трех) месяцев с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня заключения договора.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.<br>7. Контактное лицо для ознакомления с имуществом: +375295894134, Ольга Михайловна.<br>8. Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона |
| Информация о продавце | Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122, +375 29 304 59 90) |
| Организатор торгов | ООО «Фрондера»: 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by |

## Извещение о проведении 4 марта 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62161, общая площадь – 307,5 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения; капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62162, общая площадь – 47,3 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения; капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62163, общая площадь – 145,9 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения; капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62164, общая площадь – 244,5 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: литер 1А/к – здание неустановленного назначения, литер а, б, к, м – площадка; литер в, ж, н – дорожка, литер г, е, и – площадка под навес, литер д – лестница, литер п, с, ф, х, ц – калитка, литер р, т, у, ч – ворота, литер ш, э, ю – ограждение, литер л – смотровая яма; склад металлический (инв. № 100558), трансформаторная подстанция КТП-160-10/ (инв. № 48664), кабельные сети от РУ до КТП-160 (инв. № 103366) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Красина, 105, 105/1, 105/2, 105/3 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 1,5612 га, кадастровый номер 500000000002008276, целевое назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного, здания неустановленного назначения, здания специализированного автомобильного транспорта |
| **Продавец имущества** | ОАО «МТЗ», ул. Долгобродская, 29, 220070, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС** | 201 370,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 20 000,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 04.03.2021.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **4 марта 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 16.02.2021 по 02.03.2021 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017) 333-49-73, (029) 216 92 90, (029) 632 97 44, (029) 312 80 82.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 333-49-73 (ОАО «МТЗ»).

# ЧЫСТАЯ ВАДА, РАМОНТ ЖЫЛЛЯ, МЭТА-99

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— ЖКГ — галіна эканомікі і жыцця грамадства, дзе цесна пераплецены інтарэсы іншых сфер. Немагчыма ўявіць высокі ўзровень жыцця і матэрыяльнага дабрабыту людзей без развітой сістэмы жыллёва-камунальнага абслугоўвання, — адзначыў Андрэй Рамашка. — А дзяржпраграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» — адзін з інструментаў рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў цэлым. Дзяржпраграма ўключае ў сябе сем падпраграм.

«Даступнасць паслуг» — павінна садзейнічаць забеспячэнню даступнасці і якасці ЖКП, а таксама павышаць якасць і разнастайнасць бытавых паслуг.

«Добраўпарадкаванне» — скіравана на павышэнне ўзроўню добраўпарадкавання тэрыторый населеных пунктаў. Падчас яе рэалізацыі мяркуецца праводзіць капітальны рамонт і рэканструкцыю ўнутрыквартальных дваровых тэрыторый.

«Эфектыўнае цеплазабеспячэнне» — мусіць павысіць надзейнасць, тэхналагічную і эканамічную эфектыўнасць цеплазабеспячэння.

«Рамонт жылля» — уключае ў сябе «аднаўленне тэхнічных і спажывецкіх якасцяў, а таксама захаванне эксплуатацыйнай надзейнасці жыллёвага фонду. А яшчэ павінна стварыць бяспечную эксплуатацыю ліфтавага абсталявання ў дамах», падкрэсліў спецыяліст.

«Чыстая вада» — абавязана забяспечыць жыхароў вадой пітной якасці, павысіць якасць ачысткі сцёкавых вод і надзейнасць сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення.

«Мэта-99» — заклікана мінімізаваць аб'ёмы захавання цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА).

«Развіццё электраэнергетыкі і газіфікацыі населеных пунктаў» — мае на мэце будаўніцтва (рэканструкцыю) размеркавальных электрасетак працягласцю 3 464,9 км, каб грамадзяне выкарыстоўвалі больш электраэнергіі, забяспечваючы такім чынам больш камфорт свайго пражывання.

— Па выніках дзяржпраграмы чакаецца будаўніцтва каля 800 станцый абезжалезвання з мэтай забеспячэння 100 % беларусаў вадой пітной якасці да 2025 года. Неабходна пабудаваць і рэканструяваць 70 ачышчальных збудаванняў сцёкавых вод. Дасягнуць выкарыстання ў 2025-м не менш як 64 % ствараемых ЦКА. Замяніць 4727 ліфтаў у жылых дамах, — расказаў прадстаўнік ЖКГ. — Акрамя таго, штогод неабходна ўводзіць у эксплуатацыю пасля капрамонту не менш як 3,5 млн $м^2$ агульнай плошчы жылых дамоў, а таксама рамантаваць і рэканструяваць 2 % прыдамавых тэрыторый.

На працягу пяцігодкі плануецца таксама штогод зніжаць затраты на аказанне паслуг насельніцтву не менш чым на 5 %. А таксама скарацiць страты цеплаэнергіі ўласнай вытворчасці арганізацый ЖКГ з 9,8 % да 9 % да 2025 года.

**Ірына СІДАРОК.**

Сітуацыя

# ЖЭС СУПРАЦЬ «ПЛЮШКІНЫХ»

## Камунальнікі патрабуюць ачысціць кватэру ад смецця, але жыхаркі не ідуць на кантакт

**Магчыма, справа не зусім тыповая. Бо такіх «плюшкіных» у нашым асяроддзі сустракаецца няшмат. З іншага боку, усе грамадзяне маюць права на камфортнае і спрыяльнае асяроддзе, за якім сочаць жыллёва-камунальныя службы. Дзяржава забяспечвае грамадзян жылымі «квадратамі», а тыя, у сваю чаргу, павінны выконваць правілы агульнага пражывання. Але бываюць выпадкі, калі гэтыя нормы парушаюцца. Прычым, справа цягнецца не адзін год...**



### «НЯДОБРАЯ» КВАТЭРА

Работнікі камунальнай службы неаднойчы выязджалі па скаргах суседзяў у адзін з гродзенскіх шматпавярховікаў. Жыхары скардзіліся на непрыемны пах з кватэры і затапленне. Але трапіць у «нядобрую» кватэру аказалася складана. А калі нарэшце камунальныя службы атрымалі доступ, убачылі перад сабой жудасную карціну — усё жыллё ўяўляла з сябе самы сапраўдны сметнік.

Толькі аднойчы работнікі ЖЭСа змаглі зрабіць фотафіксацыю жылога памяшкання. Відовішча непрыглядное. Фотаздымкі прадстаўляла падчас судовай справы майстар ЖЭСа. Яна расказала, што ў выніку абследавання ўстаноўлена, што кватэра знаходзіцца ў антысанітарным стане, паўсюдна складзіруецца бытавое смецце, розныя рэчы, бутэлькі... Бруд на падлогавым пакрыцці, на сценах, на вокнах. Газавая пліта адключана, ракавіна і кухонныя шафкі знаходзяцца ў антысанітарным стане, у санвузле неабходна замена ўнітаза, відавочна, што прыборка доўгі час не праводзілася.

Найбольш уражвае той факт, што да такога стану сваё жытло давялі жанчыны. Быў агучаны і той факт, што жыхары дома заўважалі, як жанчына, што тут пражывае, нясе ў кватэру сабранае на вуліцы смецце.

### ЗНАЁМСТВА НЕ АДБЫЛОСЯ

Што за жыхаркі тут жывуць? Як аказалася, маці з дачкой. Не буду называць іх імёны і прозвішчы, скажу толькі, што старэйшай жанчыне пад 80 гадоў, а яе дачцэ — 46. Каб не блытацца, назавём маці Ядвігай Іванаўнай. Пражывае яна з дачкой у шматпавярховіку ў двухпакаёвай кватэры на 56 «квадратаў». Дагавор найму заключаны ў 2016 годзе.

Не буду ўтойваць, што дух рэпарцёра пагнаў мяне на гэтую вуліцу і ў гэты дом. Захацелася асобна сустрэцца з такімі дзіўнымі жанчынамі, якія ператварылі сваю кватэру ў сметнік, і сваімі вачыма ўбачыць стан кватэры. Ці сапраўды там такі жах, як расказала прадстаўнік ЖЭСа. Не інакш жанчыны добрыя віпіюхі і вядуць асацыяльны лад жыцця... Так думалася напачатку.

Паблукаўшы крыху, выйшла да патрэбнага шматпавярховіка і зайшла ў пад'езд. На пятым паверсе знайшла згаданую кватэру і націснула на званок. І хоць ён спрацаваў, але ніякіх гукаў з кватэры не было чуваць, ніхто не спяшаўся адчыняць дзверы. Зрабіўшы яшчэ дзве спробы, пазваніла суседзям. Дома аказалася гаспадыня суседняй кватэры. Яна адразу паведаміла, што яе суседка дзверы нікому не адчыняе, а яна сама за сорак гадоў пражывання бок у бок у яе кватэры ні разу не была. Звычайна прыходзяць работнікі ЖЭСа і просяць пасведчыць немагчымасць доступу. «Ну, жанчына як жанчына. Калі-нікалі я магу сутыкнуцца з ёй на пляцоўцы. Яна кудысьці ходзіць, жывуць ціха. Дачку даўно не бачу...» — паведаміла суседка. Дрэннага паху з яе кватэры зараз не чуе, кладоўку пачысцілі...

Пакольки да камунальнай службы звярталіся са скаргай і жыхары з ніжняй кватэры, зайшла і да іх. Праўда, там жыхары памяняліся, а вось суседка збоку расказала, што сапраўды, быў выпадак падтаплення. І тады таксама адбыўся суд. Што датычыцца самой жанчыны, суседка назвала яе ціхай, не агрэсіўнай, але своеасаблівай. Ні з кім не мае стасункаў, не размаўляе. Наконт смецця ў кватэры не ў курсе, а вось парадак на лесвіцы Ядвіга Іванаўна неяк імкнулася навесці. Нават аб'яву вешала, каб не курылі.

Між тым аматарка барацьбы з курэннем раз-пораз атрымлівала ад камунальных службаў прадпісанні аб навядзенні парадку ў сваёй кватэры.

### НАСУПЕРАК КАМФОРТУ

Усё пачалося, можна сказаць... з клапоў. Аб іх нашэсці і паскардзіліся ў ЖЭС жыхары суседніх кватэр. Майстар участка, якая абследавала кватэру, расказала: «Усе пакоі захламлены, ужо побач з кватэрай стаяў дрэнны пах. Пры ўваходзе ляжалі дошкі, палкі, смецце, рэчы пад пакрываам. У кухні брудны посуд, слоікі. У залу немагчыма зайсці з-за смецця, санвузел падцякае, хоць ёсць новы ўнітаз, але не ўстаноўлены».

Камунальнікі склалі пратакол аб адміністрацыйным парушэнні, які пазней быў накіраваны на разгляд суда. У прыватнасці, было прадпісана прыбраць смецце, правесці санітарную апрацоўку, замяніць унітаз.

Кватэра, дзе пражываюць жанчыны, адносіцца да жылога памяшкання камерцыйнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду. Правілы ўтрымання прадугледжаны адпаведнай пастановай урада.

Там вызначаны абавязкі як утрымальніка арэнднага жылля, так і наймальніка. У прыватнасці, за кошт наймальніка прадугледжваецца бягучы рамонт, шкленне, замена падлогі і іншыя работы. Згодна з правіламі карыстання жылымі памяшканнямі, устаноўленымі пастановай Савета Міністраў, а таксама Жыллёвым кодэксам, грамадзяне абавязаны захоўваць жыллё ў належным стане, які адпавядае санітарным, тэхнічным, прыродаахоўным, супрацьпажарным патрабаванням. Калі гэтага не адбываецца, да такіх жыхароў прымаюцца меры ўздзеяння. Як правіла, канчатковую кропку ставіць суд. У адносінах да Ядвігі Іванаўны такіх судоў было некалькі.

Наймальнікам прапаноўвалася прывесці кватэру самастойна ў належны стан, і яны абяцалі гэта зрабіць. Але паўторнае абследаванне не выявіла істотных зрухаў. Кватэра па-ранейшаму знаходзілася ў антысанітарным стане, хоць суд прыняў рашэнне выправіць сітуацыю на працягу двух месяцаў. Ці наведзены парадак у кватэры, пакуль невядома.

У ЖЭСе расказалі, што некалькі разоў імкнуліся трапіць у кватэру, але безвынікова. Дзверы так ніхто не адчыніў. Ужо і суседзям надакучылі гэтыя цяжбы, але паўплываць на неахайных жыхароў, як аказалася, вельмі складана. Хоць кватэра арэндная, выселіць жанчын амаль што немагчыма. Запазычанасці па камунальных і арэндных плацяжах у іх няма, яны своечасова і ў поўным аб'ёме ўносяць плату за кватэру. Аплачваюць і ўсе штрафы. Да таго ж сталая жанчына паводзіць сябе ціха, ні з кім не канфліктуе. Адно суцяшае — такіх «плюшкіных» у горадзе адзінкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота носіць ілюстрацыйны характар.**

### Каментарый у тэму

**Алена КАРАЛЁВА, прафесар кафедры медыцынскай псіхалогіі і псіхатэрапіі Гродзенскага медуніверсітэта:**

— У жанчыны, гаспадыні кватэры, канешне, сіндром Плюшкіна. Гэта псіхічнае захворванне. Лічыцца, што такі сіндром сустракаецца ў людзей сталага ўзросту, пасля 65 гадоў. Многія, магчыма, сутыкаліся з гэтым у сваіх сем'ях, асабліва ў адносінах да старэйшых членаў сям'і, якія перажылі вайну ці іншае ліхалецце. Звычайна прычынай такога назапашвання становяцца стрэсавыя сітуацыі.

Часцей на сіндром пакутуюць адзінокія людзі, якім няма чым займацца, іх кола інтарэсаў рэзка звужаецца і зводзіцца да такога назапашвання непатрэбных рэчаў. Быццам яны маюць нейкую справу. У нас была адна такая пацыентка, вельмі цікавая асоба, яна збірала на сметніках ці яшчэ дзе рэчы, якія маглі яшчэ служыць. І тлумачыла, што ўсё патрэбна. І, што самае цікавае, чалавек цягне са сметніка рэчы зусім не з-за беднасці. Бывае, што гэта даволі забяспечаныя людзі. У іх на разліковых рахунках ляжаць грошы, альбо ў кагосьці яны схаваны пад матрацам ці яшчэ дзе. Нейкія каштоўнасці ў іх ёсць. Аднак яны не могуць спыніцца ў жаданні пастаянна назапашваць рэчы, якія ім не неабходныя і не спатрэбяцца. Быў выпадак, калі ў доме паміж хламам прыйшлося зрабіць тунэль, праз які і хадзіў гаспадар. І кожны такі «плюшкін» прыводзіць разумныя доказы сваіх паводзін.

Магчыма, гэта звязана з нейкімі сасудзістымі парушэннямі. Праводзіліся даследаванні, якія выявілі, што такія паводзіны абумоўлены працэсамі ў галаўным мозгу. Там узнікаюць ачагі павышанага ўзбуджэння, але пакуль невядома, дзе і як гэта адбываецца.

Лячыць такіх людзей складана, таму што дыягназ цяжка паставіць. Можна прапанаваць заспакаяльныя медпрэпараты, якія здымаюць узбуджанасць. Гэта патрабуе доўгай індывідуальнай псіхатэрапіі. Але перакanaць такога чалавека амаль немагчыма. Ён не бачыць у сваіх дзеяннях нічога асаблівага.

Можна паспрабаваць адцягнуць іх увагу на нешта іншае, але і гэта таксама складана. Для грамадства яны бяспечныя, але іх гэтае «захапленне» часта прыносіць праблемы навакольным. Таму застаецца толькі адно — па магчымасці расчышчаць гэты хлам.

# ГАЛОЎНАЕ — ЛЮБІЦЬ ЖЫЦЦЁ

## Палескі траўнік — пра ковід і лекі «ад старасці»

**Верыць у травалячэнне або аддаваць перавагу сучасным дасягненням фармацэўтычнай прамысловасці, хадзіць да траўніка або ў аптэку — асабістая справа кожнага. Але ў эпоху пандэміі і аптэкі, і траўнікі не застаюцца без кліентуры...**



Дзе яшчэ жыць траўніку — чалавеку, які вывучае ўласцівасці гаючых раслін — як не на ўлонні прыроды, у вёсцы. Ну, на крайні выпадак, у маленькім гарадку... Віктар Паўлавіч жыве на Палессі, у Лунінцы, райцэнтр налічвае ўсяго 24 000 жыхароў. Нядаўна Віктар Чапуштанаў адзначыў 85-гадовы юбілей. Амаль паўжыцця ён лечыць людзей гаючымі зёлкамі. У сезон ездзіць па іх за многія кіламетры: нездарма Палессе лічыцца запаведным краем лясоў і азёр. Размяняўшы дзявяты дзясятак, Віктар Паўлавіч карыстаецца сучаснымі месенджарамі і добра адчувае сябе на прасторах інтэрнэту. І не збіраецца старэць. Мы вырашылі пагаварыць з ім пра тое, як заставацца поўным сіл да глыбокай старасці і ці кожны можа засвоіць навыкі травалячэння.

**«Не верце ў «цудадзейныя травы Тыбета» або нейкія іншыя цудадзейныя зёлкі. Цудаў не бывае. Бываюць травы, эфектыўныя пры пэўным захворванні».**

— Адкуль пра мяне даведваюцца людзі? У асноўным, спрацоўвае «сарафаннае радыё», — кажа суразмоўнік. — І тут усё проста: калі ты шарлатан і ўводзіш у зман тых, хто прыйшоў да цябе са сваёй праблемай, вельмі хутка людзі пра гэта даведаюцца. Калі ж ты сапраўды разбіраешся ў пытаннях травалячэння, заўсёды знойдуцца тыя, каму ты будзеш патрэбны.

### «ІНТУІЦЫЯ ТУТ НІ ПРЫ ЧЫМ»

— Сам я родам з Алтая. Па прафесіі — інжынер-машынабудаўнік. Працаваў у навукова-даследчым інстытуце тэхналогіі машынабудавання, маю некалькі запатэнтаваных вынаходніцтваў. Гэтая творчая работа, мабыць, прывіла мне звычку пастаянна вучыцца і асвойваць новыя веды. У 1990-я інстытут быў закрыты, інжынеры «выкінутыя на вуліцу» — стандартная для таго часу гісторыя. Прызнаюся, вывучэннем траў у тыя часы я заняўся, каб выжыць. Тым больш што Алтай багаты на лекавыя расліны. Быў час татальнага дэфіцыту, лекаў не хапала. Тады яшчэ не ведаў, што вывучэнне лекавых траў стане справай усяго майго жыцця. Але па звычцы падышоў да пытання па навуцы, акадэмічна: прачытаў не адзін падручнік па фармакалогіі, стварыў уласную бібліятэку па народнай медыцыне. У першую чаргу тады я ставіў перад сабой мэту дапамагчы сабе і блізкім. Але з часам знаёмыя, а пазней і незнаёмыя людзі сталі звяртацца да мяне як да траўніка...

***— Напэўна, у вас былі настаўнікі?***

— Так, вядома. А самы галоўны настаўнік — жыццё. Гэта вельмі таленавіты настаўнік, трэба толькі хацець вучыцца. Выдатна памятаю сваю першую «настаўніцу травалячэння», суседку па дачы. Яна навучыла мяне, як прымітыўна, у хатніх умовах, гатаваць абляпіхавы алей. Лецішча знаходзілася ў пойме Обі, абляпіхі — незлічоная колькасць. Прычым буйная, смачная, багатая на алей, вітаміны і каратын. Вядома, мне прыйшлося метад суседкі ўдасканаліць. З'ездзіў у Бійск на вітамінавы завод, вывучыў тэхналогію атрымання алею. А ўжо абсталяванне зрабіў сам, дапамаглі веды ў машынабудаванні. Вучыўся я пастаянна. І зараз вучуся кожны дзень — так бы мовіць, павышаю кваліфікацыю.

***— Ці кожны можа навучыцца травалячэнню?***

— Для сябе, на самым найпростым узроўні — так, і гэта вельмі карысныя веды. Але вось стаць траўнікам і дапамагаць іншым можа далёка не кожны. І тут самая важная якасць — нават не ўменне пастаянна набываць і паглыбляць свае веды. Галоўнае, каб чалавек меў жаданне дапамагаць іншым, любіў жыццё і людзей. Калі вы поўныя негатыўных думак і эмоцый, вы ніколі не станеце траўнікам, ды і наўрад ці захочаце ім станавіцца. А што датычыцца інтуіцыі, якую прыпісваюць спецыялістам народнай медыцыны — калі размова ідзе пра здароўе, я не рэкамендую на яе абапірацца.

***— Як вы патрапілі з Сібіры ў Брэсцкую вобласць?***

— У мяне тры сыны (як у казцы). Дык вось, пасталеўшы, яны не захацелі жыць у Сібіры і раз'ехаліся. Старэйшы жыве ў Лунінцы. Ну, а мы з жонкай параіліся і прыехалі да яго. Так што жыву ў Лунінцы ўжо даўно і вельмі люблю гэты цудоўны горад. Адзінае, мне дужа не хапае гор. У маладосці я захапляўся альпінізмам, у студэнцтве ў мяне быў другі разрад. Я рамантык гор, як бываюць рамантыкі мора. А якія неверагодныя гаючыя травы можна знайсці на горных лугах! Дарэчы, усюды, дзе я бываў і бываю, маю стасункі з мясцовымі траўнікамі, вывучаю зёлкі і народную медыцыну. Напрыклад, у гарах Алтая я даведаўся, як жыхары горных паселішчаў захоўваюць здароўе да глыбокай старасці. Яны п'юць чай з расліны «чырвоны корань». Жэньшэнь, вядомы кожнаму, дапамагае толькі пры заўчасным адрахленні, і да таго ж моцна павышае ціск. Алтайскі чырвоны корань больш бяспечны за жэньшэнь у сэнсе пабочных эфектаў. Гэтыя атрыманыя яшчэ ў маладосці веды цяпер вельмі спатрэбіліся асабіста мне. У мяне заўсёды дома ёсць чырвоны корань — сваякі дасылаюць з Алтая. Дарэчы, магу падзяліцца ім з ахвотнымі.

**«Пытанне ў тым, як пройдуць адведзеныя нам гады: будзем мы жыць поўным жыццём і радавацца кожнаму дню або выжываць, змагаючыся з болем, слабасцю і недамаганнямі».**

***— А медыцынская адукацыя ў вас ёсць?***

— У 1992 годзе я адвучыўся і атрымаў дыплом у Міжнародным цэнтры народнай медыцыны ў Кіеве. Там выкладалі прафесары ўкраінскіх медыцынскіх інстытутаў, у прыватнасці быў вялікі курс лекцый па фітатэрапіі.



### «АГУЛЬНЫХ ПРАВІЛАЎ НЕ ІСНУЕ»

***— У сувязі з ковідам у вас стала больш «пацыентаў»?***

— Ведаеце, як ні дзіўна, не. Ні з ковідам, ні з ускладненнямі пасля яго да мяне наогул пакуль яшчэ ніхто не прыходзіў. Зрэшты, да траўнікаў ходзяць з хранічнымі хваробамі. Вострыя інфекцыйныя працэсы лепш лячыць у бальніцы.

***— Ці ёсць у зёлак пабочныя эфекты?***

— Многія лічаць, што іх няма. Але на самай справе часам травы могуць даць такі пабочны эфект, што спатрэбіцца рэанімацыя. Напрыклад, для лячэння пухлін, эпілепсіі актыўна выкарыстоўваюцца атрутныя травы (балігалоў, аканіт джунгарскі, жывакост). Калі не вытрымліваць дазіроўку, можна сур'ёзна атруціцца. У лекавых траў толькі адна перавага, але яна — велізарная: можа здарыцца, што



таблетак проста няма. А травы ёсць заўсёды — значыць, вы зможаце дапамагчы сабе і сваім блізкім. Калі ў вас дастаткова ведаў, зразумела.

***— А якія гарантыі ў кліента, калі ён прыходзіць да траўніка?***

— Ніякіх. Таму я заўсёды кажу людзям: купляйце травы ў аптэках, фітааптэках. У прыватных асоб купляць можна толькі ў тым выпадку, калі давяраеце канкрэтнаму спецыялісту. Ашуканцаў у гэтай сферы шмат. Цэны на травы і прэпараты з іх у траўнікаў вышэй, чым у аптэцы. І гэта зразумела — мы ўсё робім уручную. І яшчэ я кажу тым, хто прыходзіць да мяне па дапамогу: не верце ў «цудадзейныя травы Тыбета» або нейкія іншыя цудадзейныя зёлкі. Цудаў не бывае. Бываюць травы, эфектыўныя пры пэўным захворванні. Ну, і эфект плацэба, зразумела. Шмат рэцэптаў я праверыў на сабе, многія методыкі распрацаваў асабіста для сябе. Зборы траў прапаную пераважна тады, калі ў чалавека некалькі захворванняў.

***— Раскажыце, як гатуюцца прэпараты (адвары, настойкі) з зёлак — ці можна падзяліцца агульнымі рэкамендацыямі?***

— Набываючы травы, абавязкова прасіце інструкцыю. А гатаваць і ўжываць лекі з зёлак па нейкіх агульных правілах — занятак рызыкоўны. Агульных правілаў тут проста не існуе.

### «СТАРАСЦЬ НЕ ЛЕЧЫЦЦА»

***— Травалячэнне, народная медыцына і медыцына афіцыйная — гэта супрацьлеглыя паняцці?***

— Хутчэй, травы павінны дапаўняць медыкаментознае лячэнне. Я ніколі не бяруся лячыць чалавека, пакуль ён не пабывае ў доктара і яму не будзе пастаўлены дыягназ. Але трэба разумець, што навуковая медыцына сваімі каранямі выходзіць з народнай медыцыны. Навуковую медыцыну рухалі наперад вельмі таленавітыя людзі, і яна заслугоўвае і павагі, і даверу. Таму я стараюся дапаўняць травой лячэнне, прызначанае ўрачом таму ці іншаму чалавеку. Я дапамагаю хвораму, чым магу, і не заўсёды гэта фітатэрапія. Часам трэба проста пагаварыць, даць параду, падтрымаць, абнадзеіць. Калі-нікалі — нават прыкрыкнуць: «Не трэба адчайвацца, людзі выздараўліваюць і не з такімі дыягназамі!» Зёлкі — гэта прафілактыка, часам — лячэнне. Але калі, напрыклад, патрэбна аперацыя, тут зёлкамі бядзе не дапаможаш.

***— Ці можна перамагчы старасць?***

**«Калі вы поўныя негатыўных думак і эмоцый, вы ніколі не станеце траўнікам, ды і наўрад ці захочаце ім станавіцца».**

— Мне ўжо далёка за 80, і я магу сказаць як эксперт: старасць — не хвароба, яна не лечыцца. Эліксіры вечнай маладосці чалавецтва шукала ўсю сваю гісторыю, але наўрад ці такі састаў калі-небудзь будзе вынайдзены. Немагчыма перамагчы і смерць. Нават калі чалавек — аматар здаровага спосабу жыцця, калі ён амаль ніколі не хварэе, клапоціцца пра сваё здароўе і адчувае сябе поўным сіл — прыйдзе яго тэрмін, і ён пакіне гэты свет. Пытанне ў тым, як пройдуць адведзеныя нам гады: будзем мы жыць поўным жыццём і радавацца кожнаму дню або выжываць, змагаючыся з болем, слабасцю і недамаганнямі. Якасць нашага жыцця, асабліва ў старэчым узросце, залежыць, зразумела, ад шматлікіх фактараў — але ў першую чаргу ад нас саміх... Пятнаццаць гадоў таму я купіў сабе ноўтбук і стаў вучыцца ім карыстацца, асвоіў інтэрнэт. Мне было 70. Навошта мне гэта было патрэбна? Каб трэніраваць мозг. Прырода вельмі рацыянальная. Што не выкарыстоўваецца — тое адмірае. Таму так важна ў сталым узросце штодзень выкарыстоўваць і мышцы, і розум. Калі вы цікаўныя, калі вам цікава жыць і вы стараецеся пастаянна пазнаваць новае, вы не сутыкняцеся са старэчай дэменцыяй, колькі б гадоў вам ні было.

**Дзіяна РОНІНА.**

# МУКУ КУПЛЯЮЦЬ ЧАСЦЕЙ, ЧЫМ КАСМЕТЫКУ



## Пакупнік-песіміст, праўда — не цалкам і не ўсюды

Паваротны працэс ад кіравання ковідным крызісам у бок рэгенерацыі эканомікі адбываецца павольна, лічыць Вячаслаў Сенін, эксперт рынку і дырэктар правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus. У той жа час ізаляцыя аказала імклівы і моцны ўплыў на лад жыцця насельніцтва ў розных краінах. Эканамічная нявызначанасць ужо змяніла паводзіны спажыўцоў, і вельмі можа стацца, што на многія гады наперад. Гэты факт мае сур'ёзныя наступствы для кожнай кампаніі, арыентаванай на рытэйл. Каб змяненні займелі поспех, трэба валодаць цэласным уяўленнем аб цяперашнім новым спажыўцу.

Напрыклад, у ЗША аднаўленне ранейшага дакрызіснага ўзроўню актыўнасці спажыўцоў чакаецца, па прагнозах эканамістаў і аналітыкаў, не раней чым у 2023—2024 гадах. Падчас крызісу кампанія McKinsey правяла даследаванне. Атрыманыя даныя грунтуюцца на паказчыках 13 найбольш эканамічна значных краін і дэманструюць ступень уздзеяння крызісу на насельніцтва гэтых краін, а таксама яго наступствы. Гэтыя тэмы актуальныя для 45 краін, размешчаных на розных кантынентах і ў розных рэгіянальных зонах.

— Настроі пакупнікоў моцна адрозніваюцца ў залежнасці ад рэгіёна пражывання, — адзначае Вячаслаў Сенін. — А Кітай, Індыя і Інданезія паказваюць больш высокі ўзровень аптымізму, чым астатні свет. Кітайцы мяркуюць, што іх краіна знаходзіцца куды далей на шляху аднаўлення, чым іншыя дзяржавы. А самыя песімістычныя настроі ў дачыненні да эканамічных умоў будучыні назіраюцца ў краінах Еўропы і Японіі.

**Спажыванне па-за домам практычна знікла. Электронная камерцыя прайшла праз сваё сталенне ў гіпертэмпе. Тое, на што раней патрабаваліся гады, цяпер пройдзена за некалькі месяцаў. Спажывецкі кошык тым не менш скараціўся і змяніўся па катэгорыях. Муку купляюць часцей, чым касметыку. Маленькія брэнды саступаюць месца глабальным.**

У большасці краін спажыўцы маюць намер працягваць зніжэнне выдаткаў на другарадныя патрэбы і пераразмяркоўваць сродкі на тавары першай неабходнасці. Больш за 65 % пакупнікоў плануюць прытрымлівацца падобнай мадэлі і ў будучыні. У краінах з умераным узроўнем эканамічнага шоку, такіх як Германія і Японія, падобныя змены былі менш ярка выяўленыя.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Мой дом — мая крэпасць?

У большасці краін асноўным крытэрыем выбару тавару служыць яго цана. Адчувальнасць пакупніка да цэн з'яўляецца асноўным фактарам у пошуках новага брэнда і новага месца пакупкі. На другім і трэцім месцы часцей за ўсё згадваецца зручнасць тавару і яго дасяжнасць, важная хуткасць паступлення ад прылаўка крамы да дома пакупніка. Прасочваецца таксама жаданне падтрымліваць мясцовага вытворца.

Пераход да лічбавых тэхналогій працягваецца ва ўсіх краінах і сярод усіх катэгорый тавараў. У большасці краін свету сярод насельніцтва захоўваецца высокая актыўнасць дома і нізкая па-за домам, што напрамую звязана з узроўнем дзяржаўных абмежаванняў да перамяшчэння грамадзян. (У Беларусі гэты трэнд выяўляецца ў меншай ступені). Дом ператвараецца ў мультысусвет. Дома працуюць, прымаюць ежу, гуляюць і маюць зносіны з сям'ёй і сябрамі. Хоць агульнае спажыванне і знізілася, доля выдаткаў на прадукты харчавання і хатнія патрэбы павялічылася.



Сацыяльная ізаляцыя змяніла намер спажыўцоў займацца хатнімі справамі. І такая тэндэнцыя прасочваецца ва ўсім свеце. Людзі сталі на 54 % больш гатаваць ежу, на 30—40 % павялічыліся кватэрныя забавы, на 22 % вырасла хатняе добраўпарадкаванне.

Спажыванне па-за домам практычна знікла. Электронная камерцыя прайшла праз сваё сталенне ў гіпертэмпе. Тое, на што раней патрабаваліся гады, цяпер пройдзена за некалькі месяцаў. Спажывецкі кошык тым не менш скараціўся і змяніўся па катэгорыях. Муку купляюць часцей, чым касметыку. Маленькія брэнды саступаюць месца глабальным.

## Па развіцці e-commerce мы ўсе розныя

Хоць тэндэнцыі ў розных краінах аналагічныя — адбываецца павелічэнне інтэрнэт-продажаў — аднак іх індэксы вельмі розныя. Эксперты адрозніваюць чатыры катэгорыі краін па тыпах уплыву крызісу на развіццё электроннай камерцыі.

**Часова рэгрэсіруюць.** Напрыклад, Кітай, дзе да пандэміі ўжо існаваў высокі ўзровень лічбавых і аддаленых здзелак. У гэтай краіне ўкараненне лічбавых тэхналогій не будзе вельмі значнае. Аднак будзе развівацца і паскарацца шырокае распаўсюджванне інтэрнэттэхналогій ва ўсіх сферах жыцця. І звязана гэта з культурнымі асаблівасцямі насельніцтва краіны: перавага малога фізічнага кантакту і павышаная ўвага да гігіены пры здзяйсненні пакупак.

**Вялікае ўзрушэнне.** Краіны з добра развітай эканомікай, Вялікабрытанія і ЗША, адчуюць моцны эканамічны ўдар. Ён пацягне за сабой скарачэнне другасных выдаткаў у доўгай перспектыве, а таксама істотнае скарачэнне маштабу гандлю. Е-камерцыя хутчэй за ўсё захаваецца і працягне развіццё, дзякуючы добра сфарміраванай інфраструктуры дастаўкі.

**Кітайцы мяркуюць, што іх краіна знаходзіцца куды далей на шляху аднаўлення, чым іншыя дзяржавы. А самыя песімістычныя настроі ў дачыненні да эканамічных умоў будучыні назіраюцца ў краінах Еўропы і Японіі.**

**Вялікі шок і зніжэнне лічбавай імплантацыі.** У краінах кантынентальнай Еўропы (ФРГ, Францыя, Італія, Іспанія) эканоміка таксама моцна пахіснецца, што, вядома, прывядзе да зніжэння спажывання. У іх паскоранае развіццё інтэрнэт-гандлю наўрад ці захаваецца, як у ЗША, Вялікабрытаніі ці Кітаі. Справа ў тым, што вялікі працэнт пакупнікоў тут атрымаў нездавальняючы вопыт з-за неразвітой інфраструктуры дастаўкі і якасці атрыманага сэрвісу і ўзаемадзеяння.

**Лічбавая акселерацыя.** Гэта Індыя і Бразілія. Як яны справяцца з крызісам, пакуль незразумела, але лічбавае паскарэнне мяркуецца там нават з нізкага старту.

**Спажывецкі вопыт бывае розны.** Калі ён дорыць задавальненне, ён замацоўваецца ў паводзінах, і новая мадэль замяняе старую. А калі наадварот, тады захоўваецца ранейшая мадэль.

У Італіі, напрыклад, з 60 % анлайн-пакупнікоў падчас крызісу толькі 10 % палічылі атрыманы вопыт здавальняючым. Хутчэй за ўсё там будзе назірацца абмежаваны рост e-commerce.

З іншага боку, у Кітаі назіраецца высокі ўзровень прыняцця новых прадуктаў і высокі працэнт задаволеных спажыўцоў, значыць, анлайн-пакупкі будуць расці і пасля пандэміі.

Трэнд на пакупкі ў інтэрнэт-крамах праяўляецца і ў сектары аховы здароўя. Напрыклад, у ЗША за час крызісу падвоілася або патроілася колькасць е-аптэк і е-лекараў. Каля 40—60 % спажыўцоў маюць намер працягнуць карыстацца іх паслугамі.

## З пакупніком — на ты?

Апошнім часам спажывец усё часцей знаходзіцца анлайн. Паінфармаванасць маркетолагаў аб пакупніках узнікае з інтэрнэт-крыніц, інфармацыі і забаў. Сучасны спажывец часта мяняе гандлёвую марку, таму трэба бесперапынна дадаваць інфармацыю аб брэндзе, каб прыцягнуць яго ўвагу. Прыцягнуць пакупніка лягчэй там, дзе ён часцей бывае, — у інтэрнэце.

У цяперашні момант прамая камунікацыя з кліентам незаменная. Многія кампаніі пачалі прапаноўваць тавар непасрэдна спажыўцу. Такім чынам, з'яўляецца веданне патрэб апошняга, з дапамогай фарміравання супольнасці аднадумцаў.

Адна новая кампанія змагла згенерыраваць 100 тысяч электронных адрасоў патэнцыйных пакупнікоў, дзякуючы размешчанаму ў сацыяльных сетках посту з запрашэннем скласці спіс патэнцыйных пакупнікоў новага тавару. Спіс шматразова перапосцілі ў паблік, што дазволіла вылучыць найбольш актыўных удзельнікаў, якім фірма адправіла бясплатныя ўзоры новага прадукту. Узамен былі атрыманы водгукі аб якасці вырабаў і аб'ектыўныя пажаданні ў іх удасканаленні. Апошняе дазволіла вытворцу ўнесці важныя змены ў прадукт да таго, як ён стаў даступны для больш шырокай аўдыторыі.

## Гульня дае добрыя эмоцыі

Адзінае ўражанне ад брэнда ствараецца праз сацыяльныя сеткі, СМІ і сайт вытворцы. Добрымі памочнікамі ў гэтым кірунку служаць спадарожныя таварам фірмовыя відэаролікі, як навучальныя, так і забаўляльныя. Стварэнне кнопкі для зваротнай сувязі з вытворцам дапамагае напрамую ўзаемадзейнічаць з пакупніком, даведвацца аб яго прыхільнасцях і інтарэсах. Гэта асабліва актуальна для хутка рослага рынку.

Напрыклад, кампанія Lego.com прыняла рашэнне не толькі прадаваць тавары, а таксама прапанавала сваім кліентам фірмовыя відэаролікі і гульні, якія звязаны з цацкамі Lego. Фарміруючы і ўмацоўваючы такім спосабам адзінае ўражанне ад брэнда, гэтая кампанія павялічыла аб'ём загрузкі кантэнту са сваёй анлайн-платформы карыстальнікамі на 70 %. Гэта аказалася вельмі карысным для фірмы напярэдадні выхаду на вялікі рынак Кітая.

## Чароўная палачка дапоўненай рэальнасці

Прамая камунікацыя са спажыўцамі і паслуга дапоўненай рэальнасці дазваляе праводзіць анлайн-тэсціраванне апошніх інавацый у прадуктах і паслугах кампаніі, лічыць наш эксперт. Гэта дае прадаўцу не толькі хуткі доступ да водгукаў пакупнікоў, а таксама і нескажоны інтэрпрэтацыяй некалькіх інстанцый.

**Дом ператвараецца ў мультысусвет. Дома працуюць, прымаюць ежу, гуляюць і маюць зносіны з сям'ёй і сябрамі. Хоць агульнае спажыванне і знізілася, доля выдаткаў на прадукты харчавання і хатнія патрэбы павялічылася.**

У 2018 годзе кампанія L'Oreal запусціла новую паслугу — прымерку тавараў у дапоўненай рэальнасці. Спажыўцы змаглі апрабаваць прадукцыю брэнда для макіяжу, а таксама фарбаў для валасоў, не наведваючы краму. Варта было толькі загрузіць на сайт сваё фота і пры дапамозе гэтай бескантактавай паслугі ў любы зручны час падабраць тавар на ўласны густ або з улікам рэкамендацый вядучых спецыялістаў у сферы прыгажосці. Падчас крызісу COVID-19 выкарыстанне гэтага сэрвісу значна вырасла. Цяпер паслуга ўкараняецца ў дадатковых краінах, напрыклад у Індыі.

## Сістэма падарункаў для пакупнікоў

Адзін з варыянтаў павелічэння продажаў — стварэнне спецыяльнага эксклюзіўнага асартыменту для электроннай камерцыі. Гэта дазваляе брэнду пашырыць аўдыторыю спажыўцоў, што несумненна будзе карысна. Большая частка кампаній рэалізуе свае тавары праз гандлёвых партнёраў — рознічных, аптовых прадстаўнікоў і дыстрыб'ютараў. Падзяліўшыся інфармацыяй аб спажыўцах, атрыманай за кошт зваротнай сувязі ў прамой камунікацыі, атрымаецца мінімізаваць канфлікты з гандлёвымі партнёрамі, якія часта з'яўляюцца асноўнай праблемай рэалізацыі. Захоўваецца, такім чынам, каштоўны баланс інтарэсаў.

Дадатковы варыянт — наяўнасць сезонных і слушных скідак і спецпрапановы. Яны могуць дадаткова зацікавіць спажыўца. У шэрагу краін, напрыклад Турцыі, шырока практыкуецца сістэма падарункаў для пакупнікоў. Менавіта фізічных падарункаў, а не грашовага дысконту. Такі прыём асацыюецца з клопатам і стварае прыязную прыцягальнасць брэнда і гандлёвай пляцоўкі. Напрыклад, пры куплі ювелірнага ўпрыгажэння прэзентуецца скрыначка для кольцаў, жаночага адзення — модны часопіс, пры распродажы абутку — сродак па доглядзе.

Мы пакуль на пачатку гэтага шляху, але хто ведае, што будзе заўтра.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ОАО «МАПИД» приглашает всех желающих принять участие в аукционе ПО ПРОДАЖЕ БЫВШЕГО В ЭКСПЛУАТАЦИИ ИМУЩЕСТВА

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб.17, ОАО «МАПИД».

Окончание приема заявлений – 19.03.2021 г. в 11.00. Более подробная информация об аукционе на сайте www.mapid.by или по телефону (8-017) 209-87-17.

**Аукцион состоится 16.03.2021 – в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, ОАО «МАПИД», каб. 303.**

**ЛОТ 1:** блок-модуль (гардеробная с сушильным отделением), размер 6*3*2,5 м (1999 г. в., инв. № 1943).

Начальная цена – 3804,00 руб.

УНП 100008115

## Антикризисный управляющий Правовая компания «БелПрофКонсалт»

**объявляет о проведении первых торгов в форме аукциона по продаже движимого имущества ДСУП «Передвижная механизированная колонна № 196» КУП «Минскоблсельстрой» (дата торгов: 18.03.2021 в 11.00).**

**Заявки принимаются с 16.02.2021 10.00 по 17.03.2021 17.00.**

Антикризисный управляющий Правовая компания «БелПрофКонсалт» объявляет о проведении первых повторных торгов в форме аукциона по продаже движимого имущества ДСУП «Передвижная механизированная колонна № 196» КУП «Минскоблсельстрой» (дата торгов: 02.03.2021 в 12.00). Заявки принимаются с 16.02.2021 10.00 по 01.03.2021 17.00.

**Место проведения торгов 02.03.2021 и 18.03.2021 г. Минск, пр-т Победителей, 127 оф. 312.**

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве:

https://bankrot.gov.by/Messages/MessageItem/62334

https://bankrot.gov.by/Messages/MessageItem/62310

УНП 690019088

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества государственного предприятия «Детский реабилитационно-оздоровительный центр «Ждановичи» (Продавец)

**Лот № 1:** VOLKSWAGEN TRANSPORTER, кузов (рама) № WV2ZZZ70Z3H109011. Начальная цена, с НДС – 7 575,58 бел. руб.
**Лот №2, состав:** 1. VOLKSWAGEN TRANSPORTER, кузов (рама) № WV2ZZZ70ZSH024131; 2. GAZ-33021, кузов (рама) № 33020050327896/X9633021052076968. Начальная цена, с НДС – 2 079,01 бел. руб. Местонахождение лотов: Минская обл., Минский р-н, аг. Ждановичи, ул. Вокзальная, 96.

**Аукцион состоится 19.03.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, Организатора аукциона ino.by.

**☎Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА В ОТНОШЕНИИ ПРАВА НА ЗАГОТОВКУ И (ИЛИ) ЗАКУПКУ ДИКИХ ЖИВОТНЫХ, НЕ ОТНОСЯЩИХСЯ К ОБЪЕКТАМ ОХОТЫ И РЫБОЛОВСТВА, ДЛИННОПАЛОГО РАКА НА ОЗЕРЕ БЕРЕЗОВСКОЕ СЕННЕНСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

| Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Цена продажи аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|
| Право на заготовку и (или) закупку длиннопалого рака на территории Сенненского района Витебской области | Согласно заключению ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам» промысловый запас длиннопалого рака составляет 835 кг, предельно допустимый объем изъятия – 380 кг | 580 | 290 |

ОРГАНИЗАТОР – Сенненский районный исполнительный комитет, 211120, Витебская область, г. Сенно, ул. Карла Маркса, 2, контактный телефон в г. Сенно: (02135) 41711, факс (02135) 55834, сайт: www.senno.vitebsk-region.gov.by.

ПРОДАВЕЦ – Сенненский районный исполнительный комитет, 211120, Витебская область, г. Сенно, ул. Карла Маркса, 2, контактный телефон в г. Сенно: (02135) 41711, факс (02135) 55834.

1. Аукцион состоится 26 февраля 2021 г. в 15.00 в здании Сенненского районного исполнительного комитета по адресу: Витебская область, г. Сенно, ул. Карла Маркса, 2, малый зал райисполкома.

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление, с указанием на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов.

3. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, а также представляются копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

В торгах могут принимать участие представители юридического лица и индивидуального предпринимателя при условии представления надлежаще оформленной доверенности.

4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, последний день приема документов 25 февраля 2021 г. до 17.00 по адресу: Витебская область, г. Сенно, ул. Карла Маркса, 2, каб. 17. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № BY27 AKBB 3642 3260 0091 8200 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК: AKBBBY2X. Получатель – Сенненский районный исполнительный комитет, УНП 300027582.

6. Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 «Об утверждении правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства».

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Задатки участникам, не ставшим победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней.

Участнику, выигравшему аукцион, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для их проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

7. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

## Изменения в проектную декларацию «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 1.2 по генплану. 1-я очередь строительства», опубликованную в газете «Звязда» 25.06.2020 г.

**Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства:** однокомнатных – 4, двухкомнатных – 10 единиц, трехкомнатных – 10 единиц.

**Цены на объекты долевого строительства:**

однокомнатные квартиры общей площадью 37,98 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет 1270 (тысяча сто семьдесят) долларов США.

Двухкомнатные квартиры общей площадью 59,81 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет 1170 (тысяча сто семьдесят) долларов США.

Трехкомнатные квартиры общей площадью от 75,06 м² до 75,31м². Стоимость строительства 1 м² общей площади квартиры составляет 1100 (тысяча сто) долларов США.

**Условия оплаты в рассрочку:**

Двухкомнатные квартиры общей площадью 59,81 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет 1210 (тысяча двести десять) долларов США.

Трехкомнатные квартиры общей площадью от от 75,06 м² до 75,31 м². Стоимость строительства 1 м² общей площади квартиры составляет 1130 (тысяча сто тридцать) долларов США.

Первоначальный взнос в размере от 30 % стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

На предприятии действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения.

## Изменения в проектной декларации ООО «Датч Стар», опубликованной в газете «Звязда» 11.04.2020 г.

**«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» (III очередь строительства)**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**30 однокомнатных квартир** площадью от **30** до **71** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **1190** до **1530** долларов США за 1 кв. м.

**15 двухкомнатных квартир** площадью от **80** до **95** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **1060** до **1350** долларов США за 1 кв. м.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, помещение 860

Тел.: +375 44 534 30 00, +375 29 534 30 00

УНП 191061436.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о снятии объекта с торгов

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с назначенного на 16.02.2021 аукциона по продаже права аренды (продавец – ГП «Жилищник Минщины») лота № 1 – пристроенное помещение (магазин), инв. 600/D-123081, г. Заславль, м-н Микрорайон 1, 12-46. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.01.2021 г.

УНП 691536750

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 11.03.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Лот № 1. Машино-место № 143.1 с инвентарным номером 500/D-708120461 общей площадью 18,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-355. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 12 441,60 бел. руб., задаток – 1 244,16 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Машино-место № 144 с инвентарным номером 500/D-708120463 общей площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-357. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 14 256,00 бел. руб., задаток – 1 425,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Машино-место № 147 с инвентарным номером 500/D-708120465 общей площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-360. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 14 256,00 бел. руб., задаток – 1 425,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Машино-место № 149.1 с инвентарным номером 500/D-708120468 общей площадью 20,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-363. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 12 960,00 бел. руб., задаток – 1 296,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Машино-место № 141 с инвентарным номером 500/D-708120458 общей площадью 14,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-352. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 14 688,00 бел. руб, задаток – 1 468,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Земельный участок с кадастровым номером 323582003601000001 площадью 0,1000 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, Махновичский с/с, д. Зеленый Мох, ул. Луговая, 8, с расположенными на нем строительными материалами, вложенными в строительство деревянного дома. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. **Начальная цена продажи – 999,20 бел. руб, задаток – 99,92 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Капитальное строение с инвентарным номером 613/С-14439 общей площадью 360,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 7. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623050100001002654 площадью 0,1156 га. **Начальная цена продажи – 23 068,80 бел. руб., задаток – 2 306,88 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-61160 общей площадью 3 568,7 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административно-бытовой корпус № 3. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466 площадью 10,4867 га. **Начальная цена продажи – 2 793 312,00 бел. рублей, задаток – 279 331,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Объект недвижимости в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624883000601000106 общей площадью 0,2499 га по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Багута. **Начальная цена продажи – 99 036,00 бел. руб., задаток – 9 903,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 602/С-14050 общей площадью жилых помещений 35,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Дубровский с/с, д. Бытень. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом (составные части и принадлежности: бревенчатый жилой дом с сенями, верандой и тремя сараями, уборной, колодцем). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624487000601000002 (присвоен предварительно). **Начальная цена продажи – 2 349,00 бел. руб., задаток – 234,90 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Единый объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 330/С-16038 общей площадью 113,2 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Портовая, 1Б/1. Назначение: здание специализированное водного транспорта; наименование: склад стройгруппы. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 323550100010000786 площадью 0,3401 га. **Начальная цена продажи – 18 759,60 бел. руб., задаток – 1 875,96 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-62197 общей площадью 784,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. III Интернационала, д. 199, корп. 7. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: сварочный цех. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 640400000001000321 площадью 2,9314 га. **Начальная цена продажи – 139 968,00 бел. руб., задаток – 13 996,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-13800 общей площадью 429,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. Дятлово, ул. Советская, д. 102В. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад зав. производства. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422350100002001185 площадью 0,0568 га. **Начальная цена продажи – 39 285,00 бел. руб., задаток – 3 928,50 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Земельный участок с кадастровым номером 724884000002000056 площадью 0,0997 га, расположенный по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Протасевичский с/с, СТ «Верейцы». Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 008,00 бел. руб., задаток – 100,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105 площадью 0,0676 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, садоводческое товарищество «Монолит-92», У-109. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 2 700,00 бел. руб, задаток – 270,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 16. 1/2 доли капитального строения с инвентарным номером 700/С-97805, общей площадью 48,55 кв. м, и 1/2 доли земельного участка с кадастровым номером 724481204601000106 площадью 0,100 га, расположенных по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Кадинский с/с, д.Тараново, ул. Подлесная, 5б. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. **Начальная цена продажи – 9 000,00 бел. руб., задаток – 900,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 17. Машино-место № 30 с инвентарным номером 500/D-798201873, площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радищева, 3-173. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 12 787,20 бел. руб., размер задатка – 1 278,72 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 11.03.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 05.03.2021 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **11 марта 2021 года.**

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63**

# ТАРЫФНЫ МАЙДАН

## Чаму ўкраінцаў абурылі камунальныя плацяжы?

**Абсалютная большасць — звыш 90 працэнтаў — жыхароў Украіны падтрымала пратэсты супраць высокіх тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. Гэта вынікае са справаздачы Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі (КМІС), апублікаванай на афіцыйным сайце арганізацыі. Паводле дадзеных апытання, цалкам падтрымліваюць масавыя акцыі 80,7 працэнта рэспандэнтаў, хутчэй падтрымліваюць — 10,4 %. Між тым, пратэсная хваля, якая захліснула краіну з пачатку гэтага года, дасюль не сцішылася. У прыватнасці, паведамляецца аб перакрыванні трас у Харкаўскай, Закарпацкай і Палтаўскай абласцях. Чаму ўкраінцаў абурылі камунальныя плацяжы і чаго чакаць надалей?**



### ПАЗЫКІ ЗАМАРОЖАНЫ

Дэманстрацыі стартавалі ва Украіне яшчэ 11 студзеня, паколькі ў пачатку года адбылося чарговае павышэнне тарыфаў на камунальныя паслугі — падчас пандэміі COVID-19, дзеяння абмежавальных мер для барацьбы з ёй і справакаванага эпідэміяй эканамічнага крызісу. Украінскія ўлады ацанілі маштаб пратэстаў і паабяцалі змяніць сітуацыю. Часова выконваючы абавязкі міністра энергетыкі Юрый Вітрэнка прадставіў план зніжэння цаны на газ адразу на 44 % з 1 лютага праз вяртанне фіксаванага кошту для ўразлівых груп насельніцтва. Аднак, паводле яго слоў, гэтае рашэнне неабходна ўзгадніць з Міжнародным валютным фондам (МВФ), па патрабаванні якога фіксаваныя цэны на газ і электраэнергію былі адменены.

У той жа час Вітрэнка заявіў, што субсідыі «прыгнятаюць годнасць» грамадзян. Паводле яго слоў, сітуацыя, калі большасць людзей у краіне ці значная частка атрымлівае субсідыі, ненармальная. «Таму псіхалагічна гэта таксама дрэнна для людзей», — сказаў Вітрэнка. Ён падкрэсліў, што атрыманне субсідый з'яўляецца для грамадзян сігналам таго, што яны бедныя, у той час як людзі «не хочуць адчуваць сябе беднымі». «Гэта прыгнятае іх годнасць», — дадаў в. а. міністра.

Па сутнасці, адмова Украіны ад выканання ключавога пункта мемарандума з МВФ пагражае блакіраваннем перагавораў бакоў. Сродкі краіне неабходныя — у канцы 2020 года ўлады Украіны гаварылі пра недахоп як мінімум $3 млрд у дзяржбюджэце. Днямі стала вядома, што місія Міжнароднага валютнага фонду скончыла работу на Украіне без выніку, адзначыўшы, што для завяршэння першага перагляду праграмы неабходны большы прагрэс. Гэта адзначаецца ў заяве пастаяннага прадстаўніка МВФ у краіне Ёста Люнгмана. Паводле інфармацыі dw.com, далейшыя пазыкі былі замарожаны ў сувязі з павольнымі тэмпамі рэформаў на Украіне. МВФ таксама занепакоены рашэннем урада Украіны аб вызначэнні цаны на газ ніжэй за рынкавую ў мэтах зніжэння тарыфаў для насельніцтва.

«Тарыфны Майдан» — далёка не адзіная пратэсная акцыя, якая праходзіла на Украіне ў апошні час. З сярэдзіны снежня 2020 года ў краіне пачаліся дэманстрацыі прадстаўнікоў малога бізнесу, якія патрабавалі захаваць спрошчаную сістэму падаткаабкладання і справаздачнасці, а таксама адмяніць абмежаванні на работу бізнесу падчас лакдаўну.

Павышэнне падаткаў зноў-такі адбылося з 1 студзеня 2021-га, што ўскладніла жыццё прадпрымальнікам, пішуць украінскія СМІ. У прыватнасці, адзіны падатак і адзіны сацыяльны ўклад для фізічных асоб-прадпрымальнікаў вырас з 1327 грыўняў да 1547 грыўняў. Аднак акцыі пратэсту ўсё ж удалося часткова нівеліраваць тым, што Вярхоўная рада пагадзілася на год адкласці абавязковае ўвядзенне касавых апаратаў для гэтай групы прадпрымальнікаў. Тым самым Украіна парушыла адно з патрабаванняў МВФ, бо аднаму з траншаў фонду папярэднічала ўвядзенне з 1 студзеня 2021 года фіскальнай падсправаздачнасці пры выдачы касавых чэкаў удзельнікамі спрошчанага рэжыму падаткаабкладання з абавязковым выкарыстаннем касавых апаратаў і электроннага касавага ўліку.




### «ПАДАРУНАК» НА ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

13 студзеня ўлады Украіны вырашылі вярнуцца да дзяржаўнага рэгулявання цэн на газ, каб знізіць іх для канчатковых спажыўцоў. У паведамленні на сайце прэзідэнта адзначалася, што рыначныя цэны сёння занадта вялікія, асабліва калі ўлічваць пандэмію. Як вядома, у канцы 2019-га Уладзімір Зяленскі паабяцаў зніжэнне тарыфаў амаль на 50 працэнтаў. Цана на газ у лістападзе-снежні мінулага года была ў краіне на ўзроўні 6330 грыўняў (225 долараў) за тысячу кубаметраў. З 1 студзеня яна вырасла да 9600 грыўняў (342 долары), гэта выклікала акцыі пратэсту. З 1 лютага цана на газ знізілася на 30 працэнтаў. Лімітны кошт, устаноўлены ўрадам, складае 6999 грыўняў (250 долараў) за тысячу кубаметраў. Гэта менш, чым планавалася спачатку, аднак усё ж такі больш, чым у канцы мінулага года.

Аднак пэўныя саступкі не збілі пратэсную хвалю. 25 студзеня прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі адзначыў сваё 43-годдзе, і менавіта ў гэты дзень у Кіеве, а таксама ў шэрагу іншых буйных гарадоў краіны, прайшлі акцыі, якія атрымалі красамоўную назву «тарыфны Майдан». Дэманстранты выйшлі на вуліцы ў знак пратэсту супраць павышэння плацяжоў на газ і электраэнергію. Найбольш буйная акцыя адбылася ў Кіеве каля офіса прэзідэнта. Кіраўніка дзяржавы заклікалі знізіць цану на газ да 3 грыўняў за кубаметр, а за электрычнасць — да 1 грыўні за кілават.

Таксама пратэсты закранулі Херсон, Палтаўскую, Харкаўскую і Адэскую вобласці. У Жытоміры дэманстранты прарваліся ў залу гарсавета, у Лубнах перакрылі трасу Кіеў—Харкаў, а ў Адэсе мітынгавалі каля сцен мясцовай гарадской адміністрацыі. Як піша strana.ua, актывісты выйшлі на вуліцы ўкраінскіх гарадоў з плакатамі «тарыфны генацыд» і заклікамі асабіста да прэзідэнта выканаць сваё абяцанне. Адзін з пратэстоўцаў заявіў, што за час кіравання краінай Уладзімірам Зяленскім, які падчас перадвыбарнай кампаніі абяцаў знізіць тарыфы, лічбы ў квітанцыях павялічваліся ўжо двойчы. «Чаму мы павінны плаціць за транспарціроўку газу, мы ж самі пракладвалі гэтыя трубы. Хай лепш аблгаз заплаціць нам за арэнду зямлі, за тое, што іх трубы, як яны кажуць, ляжаць на нашай зямлі», — цытуе выданне дэманстранта.

Агульная незадаволенасць эканамічнай палітыкай улады аб'яднала ўдзельнікаў розных пратэсных плыняў. Гэтым разам лозунгі прынялі вострасацыяльны характар. Людзі неслі плакаты «Лакдаўн — афшора, не — пабарам» і «Няхай палаюць палацы». У Херсоне павышэнне цэн на газ абвясцілі «тарыфным генацыдам», у Запарожскай вобласці пратэстоўцы перакрылі дарогу. Удзельнік і арганізатар пратэстаў у Харкаўскай вобласці Міхаіл расказаў, што мітынгі былі і стыхійным, і палітызаваным рухам, паведаміла ria.ru. Ён упэўнены: хваляванні толькі ўзмоцняцца. «Працягнем, пакуль прэзідэнт не накладзе вета. Мы ўжо вядзём перагаворы з іншымі гарадамі аб сумесных дзеяннях. Ва ўлады не хопіць паліцыі нас разганяць. Зяленскі ў патавай сітуацыі, гэта змяце яго, Майдан быў дзіцячым лепетам», — перакананы Міхаіл. На яго думку, разгортваецца сцэнарый Майдана 2013—2014 гадоў.

Увогуле пратэсты пераследуюць кіраўніка дзяржавы з моманту яго ўступлення на пасаду, а шэраг спецыялістаў не выключаў перазапуску Майдана яшчэ да восені мінулага года з-за сур'ёзнай страты падтрымкі сярод насельніцтва. Так, у студзені апытанне групы «Рэйтынг» паказала, што толькі 26,2 працэнта ўкраінцаў гатовыя прагаласаваць за Зяленскага, калі б выбары прэзідэнта прайшлі ў найбліжэйшы час.

Як улады, у тым ліку кіраўнік дзяржавы, будуць выходзіць з сітуацыі, што склалася, невядома. Аднак, па версіі strana.ua, сітуацыя вакол «тарыфнага Майдана» можа прывесці да сур'ёзных праблем для ўрада краіны — аж да яго адстаўкі. Крыніцы выдання адзначаюць, што ўлады не змогуць пайсці на зрыў дамоўленасцяў з МВФ. «Калі тарыфы будуць расці, то акцыі пратэсту працягнуцца, і апазіцыя іх узначаліць. Найбліжэйшая мэта, відавочна, — адстаўка ўрада [прэм'ера Дзяніса] Шмыгаля. Тым больш што па рыторыцы на гэта працуе і частка кіруючай партыі «Слуга народа». Ды і праблем рэальна хапае», — рэзюмавала крыніца выдання.

### ЗА КРАЕМ ПРОРВЫ

Паводле вынікаў апошняга даследавання, праведзенага «Украінскай сацыялагічнай групай, 94 працэнты ўкраінцаў лічаць, што тарыфы на камунальныя паслугі завышаныя. На пытанне, што стала галоўнай прычынай росту расцэнак, 44,9 працэнта рэспандэнтаў адказалі, што безгаспадарчасць і непрафесіяналізм урада, 23,6 % — змова энергетычных кампаній, 14,2 % — патрабаванні МВФ і міжнародных крэдытораў, 9,6 % — рашэнне ўлады перайсці да свабоднага цэнаўтварэння на энерганосьбіты, 3,1 % — рост сусветных цэн.

Пры гэтым праблема масавых неплацяжоў за жыллёва-камунальныя паслугі ва Украіне дасягнула велізарных памераў, заявіў кіраўнік Жыллёвага саюза краіны Аляксандр Скубчанка. Ён адзначыў, што па стане на снежань 2020 года запазычанасць насельніцтва склала 66,1 мільярда грыўняў (2,37 млрд долараў). «Пасля гэтага тарыфы яшчэ павялічылі, а значыць, неплацяжы стануць больш маштабныя. Жыллёва-камунальная галіна ўжо даўно за краем прорвы. Але адзінае, што плануе ўлада, — гэта прыняцце закона аб выбіванні даўгоў ЖКГ з насельніцтва па патрабаванні МВФ. Гэта шлях у нікуды», — сказаў Скубчанка glavred.info.

«Цэны на газ і электраэнергію для насельніцтва павінны стаць рэгуляванымі дзяржавай. Для мэт ацяплення — ільготнымі. У дзяржавы дастаткова ўласнай здабычы і генерацыі, каб забяспечыць насельніцтва больш таннымі газам і электраэнергіяй пры захаванні станоўчай рэнтабельнасці дзяржманаполіі. Усе тарыфы ў краіне павінны быць падвергнуты праверцы на прадмет захавання законаў пры іх фарміраванні і эканамічнай абгрунтаванасці ўсіх складнікаў у іх структуры, а пасля — зніжаны да законнага ўзроўню. Заканадаўства ў сферы ЖКГ павінна быць пераўтворана па прынцыпе: спажывец заўсёды мае рацыю. Дзяржава абавязана абараняць людзей, а не алігархаў. Ніякіх «рынак сам сябе адрэгулюе». Заканадаўчае забеспячэнне дзейснага дзяржаўнага рэгулявання, нагляду, кантролю і абароны правоў спажыўцоў у сферы ЖКГ. Увядзенне сертыфікавання ў ЖКГ, адміністрацыйнага і крымінальнага пакарання за парушэнні законаў і тарыфны крадзеж. Ніякіх нормаў спажывання і крадзяжу на іх завышэнні. Павышэнне якасці паслуг ЖКГ, а не іх кошту. Забеспячэнне 100 % уліку спажывання камунальных паслуг і аўтаматызацыі кантролю іх якасці», — прапанаваў свой пакет неадкладных мер Аляксандр Скубчанка.

Пакуль жа перспектывы зусім не аптымістычныя — у найбліжэйшы час украінцы могуць абурыцца ростам тарыфаў яшчэ больш, чым да пачатку «тарыфнага Майдана». Нягледзячы на заявы ўрада аб тым, што да заканчэння ацяпляльнага сезону кошт газу і гарачай вады не зменіцца, в. а. міністра энергетыкі Украіны Юрый Вітрэнка прагназуе павелічэнне «камуналкі» ўдвая. Словы палітыка працытаваў Telegram-канал «Украіна ў шоку». Як растлумачыў Вітрэнка, такі крок ураду прыйдзецца зрабіць, каб дасягнуць «поўных» цэн на камунальныя паслугі. Якім жа чынам адаб'ецца цанавая палітыка на квітанцыях украінскіх спажыўцоў? Па прагнозах Юрыя Вітрэнкі, меркаваныя тарыфы на ацяпленне і электраэнергію варта павялічыць удвая. Прыродны газ падаражэе дзесьці ў 1,5 раза. «Потым яшчэ будзе вада, потым яшчэ будзе смецце, гэта значыць усе астатнія тарыфы пацягнуцца за электраэнергіяй і газам. Умоўна кажучы, усе тарыфы вырастуць у два разы», — заявіў палітык. Пры гэтым Вітрэнка дадаў, што рэальныя, «поўныя» тарыфы для ўкраінцаў могуць стаць вялікай праблемай, улічваючы, што нават цяперашнія расцэнкі на «камуналку» далёка не ўсім па кішэні.

Раней дырэктар Інстытута развіцця эканомікі Украіны Аляксандр Ганчароў паведаміў, што абстаноўка ў сусветнай эканоміцы, якая змянілася з-за каранавіруса, і ўнутраная нестабільнасць пагражаюць Украіне «эканамічнай мясарубкай» у 2021 годзе. Здаецца, гэтыя прагнозы набываюць рэальныя абрысы.

**Пётр ДУНЬКО.**

# КАРОНА ВІТАЎТА, СУТАРЭННІ ЛІДСКАГА ЗАМКА І ЛАЦІНЬ У ЖАЛУДКУ

**Гісторыкі Ірына Масляніцына і Мікола Багадзяж правяраюць легенды**





**Сямейная пара пісьменнікаў-гісторыкаў — Ірына МАСЛЯНІЦЫНА і Мікола БАГАДЗЯЖ — выдалі не адну кнігу артыкулаў па гісторыі Беларусі. У мінулым годзе ў выдавецтве «Звязда» выйшла іх кніга «Легендарныя героі беларускай гісторыі XI — XIX стагоддзяў». Вядома, што ў мастацкіх творах на гістарычную тэматыку заўсёды перамешваюцца фантазія і вымысел. А вось у творах дакументальных гісторык мусіць аддзяляць нечыя прыдумкі ад фактаў... Ці заўсёды гэта лёгка? Тым больш што Масляніцына і Багадзяж часта вылучаюць нечаканыя гіпотэзы, даюць сваю трактоўку вядомым падзеям...**

## Навошта Вітаўт хацеў каранавацца?

***— Ці было калі-небудзь, каб вас саміх абвінавачвалі ў вымысле?***

**І. М.:** Не памятаю, каб хто-небудзь з гісторыкаў стаў у позу «Няпраўда, такога не было». Праўда, расійскія гісторыкі мала чытаюць кніг на беларускай мове. І згадваю выпадак, калі чытач з Украіны абурыўся ў інтэрнэце нашай кнігай «Слава і нясл аўе», якая выйшла яшчэ ў 1995 годзе. Абурыўся, заўважыўшы артыкулы, прысвечаныя асобам, звязаным з гісторыяй Кіева: вырашыў, што мы «перацягваем» украінскія персаналіі ў беларускі пантэон. Відаць, саму кнігу не чытаў: мы ж падкрэсліваем, што ёсць моманты, калі цяжка падзяліць гісторыю на чужую і сваю, і пры гэтым мы павінны ведаць як мага больш пра людзей, якія заззялі ў іншых народах, маючы беларускія карані, і пра тых, што не мелі беларускіх каранёў, але на Беларусі праславіліся.



***— Пра гіпотэзы... У кнізе «Легендарныя героі» вы згадваеце факт, як Усяслаў Чарадзей забраў у Ноўгарада званы Сафійскага сабора, але тлумачыце па-новаму.***

**І. М.:** Так, гэта было не рабаўніцтва, бо Усяслаў вяртаў сваю маёмасць — гэтыя званы Усяслаў замовіў для Полацкага Сафійскага сабора ў Візантыі, а па дарозе да Полацка іх перахапілі ноўгарадскія ўшкуйнікі... Гэтую версію мы знайшлі на расійскіх сайтах: Ноўгарад і Пскоў апошнім часам вельмі сур'ёзна выбудоўваюць сваю гісторыю. Часам проста адчуваеш: нешта не так з трактоўкай падзей. Ну не мог без прычыны Усяслаў Чарадзей напасці на Ноўгарад. Вось і складваецца пазл.

***— Але гэта ж няпроста — зразумець, чым кіраваўся чалавек мінулага...***

**І. М.:** Так, трэба ўлічваць менталітэт часу. Вось, напрыклад, мы рыхтавалі матэрыял пра дачку Вітаўта Вялікага Софію. Мы ўсе ведаем, што Вітаўт Вялікі хацеў каранавацца. Нават памёр, калі даведаўся, што карону па дарозе перахапілі, і каранацыя не адбудзецца. Па-рознаму даследчыкі апісвалі ягонае памкненне. Часцей за ўсё тлумачылі сярэднявечным прагматызмам, маўляў, хацеў быць не ніжэй, чым стрыечны брат Ягайла, польскі кароль. А тыя, што схіляліся да тэорыі «Вітаўт-патрыёт», сцвярджалі, што карона была патрэбна, каб аддзяліць цалкам Вялікае Княства Літоўскае ад Каралеўства Польскага. Але ўлічым менталітэт XV стагоддзя. Усе ўладары апантаныя мэтай перадаць уладу сваім нашчадкам. А ў Вітаўта сыноў забілі, засталася адна дачка, якая была замужам за вялікім князем маскоўскім. Дык, магчыма, Вітаўт спадзяваўся, што ягоным спадчыннікам стане ўнук, старэйшы сын Софіі? Калі давесці права сына Софіі Вітаўтаўны на маскоўскі прастол, адсунуўшы іншых прэтэндэнтаў, можна аб'яднаць дзве дзяржавы на прынцыпе пераважнай веры. Тады ж нават мітрапаліт, прысланы з Візантыі, быў адзіны для Літоўскай і Маскоўскай Русі. Мітрапаліт, дарэчы, вельмі спрыяў шлюбу Софіі. Каб праект Вітаўта ўдаўся, у нас была б зусім іншая гісторыя. І не трэба трактаваць, што беларускія землі далучылі б да Масквы — наадварот, да Каралеўства Літоўскага было б далучана Вялікае Княства Маскоўскае, на што, дарэчы, былі ўжо гатовыя ўсе дакументы. Сын Софіі ўнаследаваў бы прастол бацькі і карону дзеда, стаў бы каралём аб'яднанай дзяржавы. Былі моманты, калі Софія Вітаўтаўна прымірала двух мужчын, бацьку і мужа. Яны двойчы з войскамі выходзілі на берагі ракі Угры і яшчэ адзін раз выстройвалі сваіх ваяроў адзін супраць аднаго на берагах ракі Плава. Сталі, але так і не нападалі адзін на аднаго, як быццам бы нешта перашкаджала. А проста кожны з іх думаў пра будучае, пра свайго спадчынніка, які быў у іх адзін.

## Ці быў у Лідскім замку падземны ход?

***— Я заўважыла, што ў аснове многіх вашых гістарычных гіпотэз — легенды і паданні.***



**І. М.:** Іх з'яўленне адбываецца не проста так. Народ такім чынам запамінаў важныя падзеі, пераказваючы іх змест больш прыгожай мовай. Скажам, жыхары Ліды абавязкова распавядуць паданне пра князёўну Ліду, дачку Гедыміна, у гонар якой нібыта названы гэты іх горад. Мы ведаем усе хрысціянскія імёны дачок Гедыміна, акрамя імені Бірутэ, якая выйшла за Давыда Гарадзенскага. Ці магла яна быць ахрышчана Лідзіяй? Магла. Тым больш што Лідскі замак быў пабудаваны якраз у тыя гады, калі Бірутэ загінула. Тое, што Бірутэ магла быць ахрышчана перад вянчаннем з Давыдам Гарадзенскім як Лідзія, не даказана, але мы маем права на такую гіпотэзу. Дарэчы, мы ведаем яшчэ адно народнае паданне пра той жа час, як прыходзілі пад Лідскі замак ордэнскія місіянеры, і іх прынеслі ў ахвяру паганскім багам людзі Гедыміна, развесіўшы на соснах каля замка. Такое магло здарыцца пасля гібелі Гедымінавай дачкі ад рук крыжаносцаў. Менавіта ў той час Гедымін прылюдна заявіў, што рве ўсе прыязныя зносіны з тэўтонцамі. Так што, магчыма, і тут у выглядзе народнага падання захавалася памяць пра канкрэтны факт.

**М. Б.:** Але часам бывае, легенда ці паданне не вытрымліваюць праверкі. Калі я ўдзельнічаў у раскопках у Лідскім замку, шмат чуў ад мясцовых жыхароў пра падземны ход у адной з веж. Знаходзіліся відавочцы: бацька, маўляў, бачыў, я лазіў, калі быў маленькі. Прыступкі вядуць уніз, а далей — ход, які вядзе далёка-далёка. Улічым, што замак быў пабудаваны на выспе, на гары пяску, якім засыпалі балота, што робіць існаванне падземнага хода сумніўным. Але сапраўды, мы адкапалі чатыры прыступкі, якія вялі ў сутарэнне пад вежай. Але там аказалася закрытае памяшканне, у ім мы знайшлі нейкі развалены цэбар, відавочна для вады. І хутчэй за ўсё, гэта была вязніца. Вакол — падмурак з велізарных валуноў і ніякага падземнага хода, хоць мясцовыя жыхары мне пальцам тыкалі, дзе ён павінен быць.

## Герб са змяёй і няшчасная Ганна Ягелонка

***— Але я веру, што ў кожным паданні, калі яго прааналізаваць, можна знайсці зашыфраванае пасланне пра рэальныя падзеі і асоб.***

**І. М.:** Пагаджуся. Згадаем паданне пра герб Пружан і каралеву Бону Сфорца... На тым гербе — звілістая змяя з залатой каронай, якая глытае дзіця. Згодна з легендай, прыехала ў горад маладая каралева Бона з маленькім дзіцем, плыла яна на лодцы, дзіця ўпала ў ваду і патанула. Так і з'явіўся герб: змяя паглынае немаўля. Адразу згадваецца, што змяя прысутнічае не гербе Сфорца, так што сувязь з каралевай ёсць. Але з дзецьмі Боны такога не адбывалася. І тут мы выходзім на іншага рэальнага чалавека. Герб Пружанам прапанавала Ганна Ягелонка, дачка Боны Сфорца, якая была таксама ўладальніцай горада. Але Бона прыплыла ў Пружаны маладая, прыгожая, яе запомнілі. А Ганна, калі прыехала знаёміца з палескім краем і сваімі падданымі, была старая, стомленая, яна нікому не спадабалася, хоць шмат зрабіла для тых мясцін. Таму ў народнай памяці і засталася Бона. А сэнс, які ўкладвала ў герб Ганна, такі: змяя з герба Сфорца паглынае Ганніных ненароджаных дзяцей. Ганна Ягелонка не змагла нарадзіць, таму што маці доўга не дазваляла ёй выйсці замуж.



**М. Б.:** Цікава, але некаторыя аповеды, якія ў савецкія часы разглядаліся як паданні, насамрэч былі цалкам гістарычнымі паведамленнямі. Напрыклад, паданне Лошыцкага парку. Сапраўдная гаспадыня парку і сядзібы, пані Ядвіга Любанская, сапраўды ўтапілася ў рэчцы, магчыма, і ўпраўду з-за кахання. А вось пра здань пані Ядвігі, што з'яўляецца ў парку кожны раз, як зацвітае магнолія кобус, было прыдумана рамантычна настроенымі мінчанамі літаральна на нашай памяці. Другі прыклад народнай творчасці суайчыннікаў паслярэвалюцыйнага часу — узнікненне падання пра Станькава, маёнтак, які належаў графу Гутэн-Чапскаму. Маўляў, маладая графіня пакахала садоўніка, які стварыў там парк. Пра тое даведаўся граф. Па адной версіі, садоўніка закатавалі, па другой — графіня дапамагла яму ўцячы. У сюжэце назіраецца яўнае імкненне выдумшчыкаў далучыць графа Чапскага да кагорты «паноў-самадураў», «прыгнятальнікаў простага люду». І безумоўна, распавядаць такое магчыма было толькі таму пакаленню савецкіх грамадзян, якія не ведалі нічога пра рэальнага графа Гутэн-Чапскага, даследчыка даўніны, збіральніка рэдкасцяў, які яшчэ пры жыцці завяшчаў сваю багатую калекцыю народу. Яго жонка была яго паплечніцай і аднадумцам. На той момант, калі Станькаўскі парк ствараўся, графіні было ўжо за сорак. Малаверагодна, каб нейкі там малады садоўнік стаў да яе б нейкім чынам заляцацца.

## Адкуль у Жалудку лацінская мова?

**І. М.:** У свой час я збірала паданні і легенды, і вельмі шмат знаходзіла такіх, якімі можна дапаўняць гістарычныя нарысы. Але многае даказаць немагчыма. Ёсць гарадскі пасёлак Шарашэва ў Пружанскім раёне. Лічыцца, што назва паходзіць ад імя Шэраш, нібыта быў такі разбойнік, які разам са сваімі паплечнікамі і перахапіў карону Вітаўта Вялікага. Згадваюцца ў паданні рэальныя падзеі? Так. Але давесці, што карона насамрэч была ўпалявана разбойнікамі, мы не можам, і ці быў такі Шэраш — таксама не ведаем. Згодна з іншым паданнем, Давыд Гарадзенскі, калі загінуў, быў прынесены воямі на шчытах і пахаваны каля гродзенскай Каложскай царквы. Нідзе ў хроніках і летапісах пра гэта не напісана, тым не менш, паданне такое вартае, што на яго пастаянна спасылаюцца. Чула, што ў Гародні ідзе размова пра неабходнасць правесці раскопкі каля Каложскай царквы. Калі знойдуць княжацкае пахаванне, зразумеем, што гэта не проста легенда.

**М. Б.:** А бывае, сустрэнеш факт, які здаецца неверагодным, пакуль не разгадаеш. У дзевяностых быў я ў мястэчку Жалудок і заўважыў, што шмат хто з мясцовага насельніцтва называе кветкі на лаціне. Папытаўся, чаму? Кажуць — гэтак бацька называў, дзядуля, бабуля... Адкуль такое? Разабраўся... Аказалася, у тых мясцінах жыў французскі батанік Жыльбетра разам з братам-медыкам. Яны працавалі на падскарбія Антонія Тызенгаўза, якому належаў Жалудок. Тызенгаўз стварыў у Гародні медыцынскую акадэмію, шмат запрашаў вучоных з Еўропы. Я знайшоў, як той Жыльбетра яшчэ крыўдзіўся, што Тызенгаўз падмануў з аплатай. Дык вось, той батанік наймаў мясцовых людзей, каб яны дапамагалі складаць гербарыі, так і прывучыў сялян да лацінскіх назваў.

***— Нарысы, якія ўвайшлі ў кнігу «Легендарныя героі», друкаваліся шмат гадоў таму ў часопісе «Беларусь», іх афармляў Арлен Кашкурэвіч... Вы дараблялі нешта?***

**І. М.:** Па-першае, толькі частка нарысаў, якія склалі аснову гэтай кнігі, раней друкавалася ў часопісе «Беларусь». Ілюстрацыі для цыкла, сапраўды, спецыяльна ствараў Арлен Міхайлавіч. Іншыя свае малюнкі з выявамі гістарычных асоб ён прапанаваў нам, пасля таго як узнікла ідэя стварэння кнігі. Але нічога ў першапачатковым выглядзе ў друк не пайшло. Перавага і выдаткі людзей, якія працуюць у гістарычнай публіцыстыцы, у тым, што ўвесь час прыходзяць новыя звесткі, і калі ты сумленны даследчык, то ў наступным выданні абавязкова новыя звесткі дадасі, нешта скарэктуеш. Нават калі кніга ўжо была падрыхтавана да друку, мы настаялі на ўнясенні нейкіх істотных правак у главы пра Усяслава Чарадзея і Давыда Гарадзенскага.

**М. Б.:** Пакуль сядзелі дома на каранціне, пісалі кніжкі... Сярод іх — кніга пра легендарнага доктара Яўгена Уладзіміравіча Клумава, які падчас нямецкай акупацыі дапамагаў мінскім падпольшчыкам і скончыў сваё жыццё ў канцлагеры. Чакае свайго часу і кніжка пра Софію Вітаўтаўну. І даўно падрыхтаваны да друку наш рукапіс «Вянок жаночых лёсаў» пра пяцьдзясят славутых жанчын беларускай гісторыі.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Архіўныя гісторыі

**Сёння на старонках газеты мы пачынаем новую рубрыку, якую будзе весці дырэктар Дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Беларусі Ганна ЗАПАРТЫКА.**

**Якія таямніцы захоўваюць архіўныя фонды? Якія, здавалася б, усім вядомыя «факты» не адпавядаюць гістарычнай праўдзе? Што новага і нечаканага можна знайсці пра вядомых персон? Запрашаем у падарожжа па архіве!**

Алаіза ПАШКЕВІЧ:

# ТАЯМНІЦА ШЛЮБУ, ПЕРЫПЕТЫІ НАВУЧАННЯ І «ВЯСКОВАЯ МАНЕРА»

**У лютым мінае сто пяць гадоў з дня смерці адной з самых вядомых жанчын Беларусі — нашай слаўнай Цёткі, Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч, паэткі, празаіка, публіцыста, вялікай асветніцы. Першыя біяграфічныя звесткі пра яе з'явіліся ў газеце «Гоман» за 15 лютага 1916 г. у некралогу «Алойзія Пашкевіч-Кайрысова», які пачынаўся словамі: «Яе жыццё — то была безупынная праца для свайго народу».**
**Але гэты артыкул не быў пазбаўлены некаторых фактычных памылак датычна яе біяграфіі, якія пасля паўтараліся многімі аўтарамі работ пра Цётку.**

Упершыню падрабязна пра сям'ю і дзяцінства Алаізы Пашкевіч расказала Марыя Мілючанка ў рэфераце «Грамадская і літаратурная дзейнасць Цёткі», прачытаным у Вільні ў 20-я ўгодкі са смерці паэткі і пазней апублікаваным асобным выданнем. Праз дваццаць гадоў, у 1956 г., убачыў свет выдадзены асобнай кнігай крытыка-біяграфічны нарыс Лідзіі Арабей «Цётка (Алаіза Пашкевіч)». Гэтая кніга стане першым падрабязным даследаваннем яе жыцця. Аўтар нарыса пайшла шляхам архіўных пошукаў, выявіўшы найперш у сховішчах Вільні біяграфічныя дакументы Алаізы Пашкевіч, у Дзяржаўным гістарычным архіве ў г. Гродна — метрычную кнігу Васілішкаўскага касцёла з запісамі аб вянчанні 23 мая 1865 г. бацькоў Алаізы і хрышчэнні іх дзяцей. Амаль адначасова, у 1954 г., з'явіліся ўспаміны Сцяпонаса Кайрыса — мужа Цёткі. Варта згадаць і тое, што па ліст-просьбу Міхася Клімковіча ў 1946 г. Іларыён Свянціцкі адгукнуўся ўспамінамі пра яе жыццё ў Львове. Тэму «І. Свянціцкі і Цётка» ў свой час даследавалі Рагойша і Кабржыцкая і ўнеслі многа ўдакладненняў у яе біяграфію. У БДАМЛіМ дакументы Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў колькасці 266 адзінак захоўвання, у тым ліку дакументы Цёткі, паступілі ў пачатку 1960-х гадоў з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літвы па распараджэнні Архіўнага ўпраўлення Літоўскай ССР. Дарэчы, менавіта Свянціцкі расказаў гісторыю некаторых дакументаў Цёткі, якія захоўваліся ў музеі і ў 1960-я паступілі ў сучасны БДАМЛіМ: «Не асабістыя ўніверсітэцкія паперы (індэкс, пасведчанне) былі выдадзены з абменных фондаў Нацыянальнага музея [у Львове] 19 мая 1931 года для Беларускага музея ў Вільні». Апошняе значнае паступленне дакументаў да біяграфіі Цёткі адбылося ў складзе архіва пісьменніцы Валянціны Коўтун, аўтара рамана пра Цётку «Крыж міласэрнасці» і шматлікіх артыкулаў пра яе.

## Булачкі ў парце

Пачнём вось з гэтага цікавага дакумента: пасведчання Віленскай прыватнай сямікласнай вучэльні аб пераводзе ў вышэйшыя класы вучаніцы Алаізы Пашкевіч.

У 1892 г. шаснаццацігадовую Алаізу разам з малодшым братам Юзікам, з якім разам гадавалася ў Тарэсіне, бацькі адпраўляюць у Вільню пад апеку старэйшай сястры Марыі. Праз два гады прыватных урокаў, у 1894 г., Алаіза паступіла ў чацвёрты клас рускага прыватнага вучылішча Веры Міхайлаўны Празаравай. Будучы па характары вельмі незалежнай, не жадаючы абцяжарваць сястру, старалася дзеля аплаты сваёй вучобы зарабляць самастойна. Заробак прыватнымі ўрокамі мела слабы, а таму часта галадала.




У нашым архіве захоўваецца часопіс «Конадні» за 1954 год з успамінамі Юльяны Вітан-Дубейкаўскай, дзе чытаем:

*«Мая старшая сястра Жэня і я паступілі ў прыватную гімназію Веры Міхайлаўны Празаравай, таму што ў казённую гімназію прымалі дачок расейскіх чыноўнікаў, і каб папасці туды, трэба было мець пратэкцыю. У нашай гімназіі быў пераважна мясцовы элемент: шмат польскіх шляхцянак, затым яўрэйкі, былі і караімка, і татарка, і некалькі расеек... І беларуска знайшлася ў нашай гімназіі, і то асаблівая. У вышэйшых класах разам з маёй сястрой вучылася Алойзія Пашкевіч... Яна была старэйшая за другіх дзяўчат у класе. Казалі, што яна прыехала з вёскі. Яна трымалася асобна ад другіх, была маламоўная, але з маёй сястрой яна зыйшлася бліжэй, бо сястра ёй памагала адрабляць лекцыі французскай і нямецкай мовы, якімі Ал. Пашкевіч слаба ўладала. Наогул аб сваім жыцці й сям'і Ал. Пашкевіч ніколі не гутарыла, сястра ведала толькі, што яна жыве ў знаёмых на прадмесці. Але раз у гімназіі паўстаў вялікі пераполах, Ал. Пашкевіч, вучаніца сёмай клясы, абамлела ў часе лекцыі, і школьная лекарка прызнала, што яна гэтак аслабела ад недаядання. Памятаю, мая сястра са слязьмі апавядала ў хаце, што Ал. Пашкевіч гэтак бедная, што на яду не хапае, але яна вельмі амбітная й не хоча прыймаць помачы. Мая маці сказала тады мне: «Я буду даваць табе булкі на дваіх, а ты кладзі ў яе столік, калі яе няма ў клясе». Мне гэта рабіла асаблівую прыемнасць — прыходзіць у клясу сястры і класці непрыкметна булкі ў пюпітр Ал. Пашкевіч. Яна спачатку пыталася ў клясе, хто гэта палажыў булкі ў ейны пюпітр, аднак віноўніца не адклікалася, і клясавая дама супакоіла яе, што гэта, мусіць, падарунак. Гэтак мы рабілі да сканчэння гімназіі... Наша Вера Міхайлаўна мела добрае сэрца і на бацькоўскім савеце паруплілася, каб Ал. Пашкевіч прызначылі стыпендыю... Яна кідалася ў вочы сваім бледным, паважным тварам, які не блістаў свежасцю і красой маладосці, але які сваімі сур'ёзнымі вачыма, трохі выступаючымі скуламі, тонкімі і зжатымі губамі, казаў аб сіле і цвёрдасці характару».*

Праз слабое здароўе і па патрабаванні дактароў Алаізе Пашкевіч прыйшлося на шостым класе перапыніць вучобу і жыць некаторы час на вёсцы, дзе працавала настаўніцай. У 1899 г. Алаіза вяртаецца да вучобы ў гімназіі Празаравай і паступае зноў у шосты клас.

У архіве захоўваецца копія пасведчання аб сканчэнні вучылішча ад 5 чэрвеня 1901 г., якое Алаіза Пашкевіч атрымала і зноў выехала на вёску. Праз год, 27 чэрвеня 1902 г., у названым пасведчанні з'явіўся запіс наступнага зместу:

*«Поименованная в сем свидетельстве Алоиза Пашкевич выдержала в испытательном комитете при управлении Виленского учебного округа специальное испытание на звание домашней учительницы арифметики и получила из управления названного округа свидетельство на это звание».*

Яна яшчэ два гады працавала настаўніцай у вёсцы і ў 1903 г. (па пераканаўчым доказе Вячаслава Рагойшы) накіравалася ў Пецярбург, каб паступіць на Курсы выхавацелек і кіраўніц фізічнай адукацыі Лесгафта (так курсы называліся, калі там вучылася Цётка).

Ці скончыла Цётка курсы?

Дакументальныя матэрыялы сведчаць, сцвярджае Рагойша, што Алаіза Пашкевіч курсаў не скончыла. Калі браць пад увагу звесткі дакументаў Дзяржаўнага гістарычнага архіва Санкт-Пецярбурга (ДГА Сп-Б,Ф.139, воп.1, адз. зах. 8406 а, л.106; прозвішча А. Пашкевіч стаіць у спісе слухачак пад № 414), у 1904 г. яна павінна была прыступіць да слухання лекцый як першакурсніца.

## Львоўскі філосаф Алаіза

А ці ведалі вы, што Цётка мела і адукацыю філосафа? Сярод іншых дакументаў, што датычыцца яе вучобы, захавалася заліковая кніжка Львоўскага ўніверсітэта за 1912 год.

Да таго ў жыцці паэткі здарылася шмат: у Пецярбургу Алаіза вытрымлівае «спецыяльныя іспыты» (экстэрн) у Аляксандраўскай жаночай гімназіі з вельмі добрымі вынікамі, і іспыт па лацінскай мове пры Першай гімназіі ў Пецярбургу, мае права паступлення ва ўніверсітэт. Але ў 1904 годзе вяртаецца ў Вільню і ўладкоўваецца на работу ў Віленскую акругову псіхіятрычную бальніцу. Фельчарка Алаіза Пашкевіч згадваецца ў абвінаваўчым акце па «Справе лекараў» у другой палове 1905 года. Згодна з паказаннямі нейкіх Сцяпана Дзёміна і Соф'і Лістоўскай, Алаіза Пашкевіч брала ўдзел у сходах «групоўкі, якія праходзілі на кватэры доктара Яўгенія Клевезела і студэнта-практыканта Гірша Падзельвера. На мітынгах, якія адбываліся ў лякарні, яна прамаўляла на беларускай мове, намаўляючы слухачоў да непадпарадкавання ўладам, нясплаты падаткаў і барацьбе супраць ураду». Адправілася ў эміграцыю ў Львоў, нелегальна наязджала ў Вільню і Пецярбург і нават стала адным з заснавальнікаў першай беларускай газеты «Наша доля», дзе ў першым жа нумары былі надрукаваны яе верш «Наш палетак» і апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі».

Па ўспамінах Свянціцкага, Цётка прыехала ў Львоў у лютым 1908 г.

«Была яна па-асабліваму разгубленая, неспакойная, у гутарцы пераскоквала з тэмы на тэму, ва ўсім выяўляла сваю нервовасць і нейкую неўраўнаважанасць».

Пасля ён даведаўся пра яе хваробу і пра тое, што яна лячылася кумысам недзе ў Кіргізіі.

У тым жа годзе Цётка выехала ў Кракаў, дзе стала слухачкай гуманітарнага аддзялення Ягелонскага ўніверсітэта. А праз год зноў вярнулася ў Львоў. Вось там і паступіла на філасофскі факультэт універсітэта. Захавалася заліковая кніжка за 1912 г. — ці па латыні «index lectionum», якая ўказвае на год яе вучобы, называе яе педагогаў і, што вельмі каштоўна, змяшчае фотаздымак Алаізы Кайрыс.

## Дзіўны шлюб

А вось яшчэ цікавы дакумент: метрычная выпіска з кнігі Віленскага касцёла ўсіх святых аб шлюбе Цёткі.

